Пролетарыі ўсіх краін, еднайцеся!

Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

ОРГАН ЦК КП(б) БЕЛАРУСІ, СОУНАРКОМА
І ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА БССР

118 (7285) | Серада, 15 лістапада 1944 г. | Цана 20 .кап

„Сілы Чырвонай Арміі шматразова памнажаюцца зладжанай работай совецкага тыла. Рабочыя, калгаснікі, інтэлігенцыя з чэсцю выконваюць свой абавязак перад Радзімай, гераічна пераадольваюць цяжкасці ваеннага часу, бесперабойна забяспечваюць Чырвоную Армію ўзбраеннем, агнепрыпасамі і прадавольствам. Совецкая гаспадарка няспынна нарашчвае свае сілы і аказвае ўсё ўзрастаючую дапамогу фронту“

(І. СТАЛІН).

ЗІМА—АДКАЗНЫ ПЕРЫЯД У РАЗВІЦЦІ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

У гістарычным дакладзе аб 27-й гадавіне Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі Старшыня Дзяржаўнага Камітэта Абароны таварыш Сталін, гаворачы аб вялікім подвігу совецкага народа ў Айчыннай вайне, так ахарактарызаваў працу калгаснага сялянства:

«Армія не можа ваяваць і перамагаць без сучаснага ўзбраення. Але яна не можа таксама ваяваць і перамагаць без хлеба і без прадавольства. Чырвоная Армія на чацвертым годзе вайны, дзякуючы клопатам калгаснага сялянства, не адчувае недахвату ў прадавольстве. Калгаснікі і калгасніцы забяспечваюць рабочых і інтэлігенцыю прадавольствам, а прамысловасць — сыравінай, забяспечваюць нармальную работу заводаў і фабрык, якія вырабляюць узбраенне і снаражэнне для фронта. Наша калгаснае сялянства актыўна і з поўным усведамленнем свайго абавязку перад Радзімай садзейнічае Чырвонай Арміі ў дасягненні перамогі над ворагам».

Словы правадыра натхняюць калгаснікаў і сялян - аднаасобнікаў нашай рэспублікі на новыя працоўныя подвігі ў імя хутчэйшай перамогі над ворагам. Кожны працаўнік вёскі жыве цяпер адным імкненнем — даць больш харчавання арміі і краіне, дастаткова сыравіны—прамысловасці.

Ажыццяўляючы гэтае імкненне, беларускае сялянства адзінадушна адгукнулася на патрыятычны пачын украінскіх калгаснікаў і здало звыш плана ў фонд Чырвонай Арміі мільёны пудоў хлеба. Абозы з хлебам і бульбай і цяпер ідуць на нарыхтоўчыя пункты.

Але фронту і краіне патрэбны не толькі хлеб і бульба, а ў няменшай ступені патрэбна мяса, тлушчы, малако і іншыя прадукты жывёлагадоўлі. Перад сялянствам нашай рэспублікі стаіць вялікая і адказная задача—за самы кароткі час у поўным даваенным аб'ёме аднавіць жывёлагадоўлю, зрабіць калгасы і соўгасы ўсебакова развітымі гаспадаркамі.

Для развіцця жывёлагадоўлі, а таксама птушкагадоўлі Беларусь мае выключна спрыяючыя ўмовы і багатыя перспектывы. Партыя і ўрад, народы брацкіх рэспублік аказваюць беларускаму сялянству вялікую дапамогу для хутчэйшага аднаўлення жывёлагадоўлі. Задача партыйных, совецкіх і зямельных органаў, усіх калгаснікаў, рабочых соўгасаў — зрабіць нашу рэспубліку рэспублікай высокаразвітай жывёлагадоўлі.

Паспяхова аднаўляючы арцельныя гаспадаркі, калгаснікі раду раёнаў і абласцей дабіліся ўжо значных поспехаў у аднаўленні грамадскай жывёлагадоўлі. У калгасах Магілеўскай обласці налічваецца ўжо 1.555 ферм буйнай рагатай жывёлы, 1.042 аўцагадоўчыя фермы, 118 свінагадоўчых ферм і 207 птушкаферм. Папаўненне жывёлагадоўчых ферм ідзе за кошт кантрактацыі маладняка і дапамогі брацкіх рэспублік. З усходніх раёнаў Саюза калгасы обласці атрымалі ўжо 11.000 галоў буйнай рагатай жывёлы, 17.000 галоў авечак, 2.000 штук птушак. У обласці ёсць калгасы, якія ўжо маюць па 3—4 жывёлагадоўчыя фермы. Да ліку іх адносіцца сельгасарцель «Ударнік пяцігодкі», Касцюковіцкага раёна, у якой адноўлены тры жывёлагадоўчыя фермы і створана ферма вадаплаваючай птушкі.

У буйнейшай сельгасарцелі «Правда», Мсціслаўскага раёна, да вайны жывёлагадоўля была адной з высока прыбытковых галін арцельнай гаспадаркі. Нямецкія акупанты знішчылі калгасную жывёлагадоўлю, спалілі будынкі ферм. З першага дня вызвалення калгаснікі актыўна ўзяліся аднаўляць грамадскую жывёлагадоўлю. За год вольнага жыцця яны дабіліся значных поспехаў у гэтай галіне. На МТФ ёсць цяпер 124 каровы і 49 цялят. Адноўлена конеферма, аўцаферма, пасека. Калгаснікі загадзя паклапаціліся аб тым, каб падрыхтаваць жывёле цёплую і сытую зімоўку. Тут пабудаван новы кароўнік, добра ацеплены прыстасаваныя памяшканні, нарыхтавана дастаткова кармоў.

Значных поспехаў у развіцці грамадскай жывёлагадоўлі дабіліся калгаснікі Гомельскай, Палескай і раду іншых абласцей. Але гэта пакуль першыя крокі. Нават у гэтых абласцях не ўсюды яшчэ грамадскай жывёлагадоўлі аддаецца належная ўвага, не ўсюды яшчэ кіраўнікі калгасаў і соўгасаў па-большэвіцку змагаюцца за хутчэйшае вырашэнне гэтай важнейшай народна-гаспадарчай задачы.

Надыходзіць зіма, якая з'яўляецца адказнейшым перыядам у развіцці жывёлагадоўлі. Ад таго, як будуць ацеплены і абсталяваны жывёлагадоўчыя памяшканні, як будзе наладжана кармленне, вадапой і догляд жывёлы, залежыць яе рост, яе прадуктыўнасць. Нямногія дні, якія асталіся да стойлавага перыяду, трэба скарыстаць для таго, каб як мага лепш ацяпліць памяшканні ферм, пабудаваць у іх станкі, кармушкі. «Цёплы хлеў кармы беражэ»,--гаворыць народная прыказка. І сапраўды так. У халодным хляве жывёла спажывае значна больш кармоў, разам з тым яна падвяргаецца розным захворванням, якія ў сваю чаргу цягнуць за сабой адыход, асабліва маладняка. Гэтага дапусціць ніяк нельга.

Ужо цяпер у кожным калгасе і соўгасе павінен быць наведзен строгі парадак у хаванні і выдатканні кармоў. Нельга дапускаць такіх фактаў, калі ў радзе калгасаў не прыбраны ў належныя месцы і гніюць на двары каштоўнейшыя гуменныя кармы — мякіна, аціра, салома. Усё гэта спатрэбіцца зімой. Трэба каб усюды былі складзены нормы і планы выдаткавання кармоў, а ўсе кармы па акту пераданы на фермы. Гэта абавяжа работнікаў жывёлагадоўлі несці асабістую адказнасць за правільнае выкарыстанне і хаванне кармоў.

З пачаткам стойлавага перыяду работнікі жывёлагадоўлі павінны адразу-ж правільна арганізаваць сваю працу, ні ў якім разе не дапускаць абязлічкі ў доглядзе жывёлы, павінны ўстанавіць строгі расклад дня.

Нядаўна ў абласцях і раёнах адбыліся нарады па жывёлагадоўлі, на якіх выявілася, што ў радзе месц кіраўнікі калгасаў не па-сур'ёзнаму адносяцца да падбору людзей на фермы. А поспех жывёлагадоўлі перш за ўсё вырашаюць людзі — загадчыкі ферм, цялятніцы, конюхі, даяркі, птушніцы. Падбіраць на гэтыя пасады трэба лепшых, вопытных калгаснікаў і калгасніц, якія любяць сваю справу.

Ад імені ўсіх калгаснікаў удзельнікі абласных нарад па жывёлагадоўлі ўзялі на сябе канкрэтныя абавязацельствы па хутчэйшаму развіццю грамадскай жывёлагадоўлі. Разгортваючы соцыялістычнае спаборніцтва, работнікі жывёлагадоўлі павінны не толькі выканаць, а і значна перавыканаць узятыя абавязацельствы. Гэта будзе лепшай дапамогай калгасных жывёлаводаў, усяго сялянства Беларусі нашай доблеснай Чырвонай Арміі ў выкананні ёю святой задачы па разгрому фашысцкага звера ў яго логаве.

Выданне даклада і Загада таварыша Сталіна на беларускай мове

Днямі Беларускае Дзяржаўнае выдавецтва выпускае асобнай брашурай на беларускай мове даклад Старшыні Дзяржаўнага Камітэта Абароны таварыша І. В. Сталіна на ўрачыстым пасяджанні Маскоўскага Совета дэпутатаў працоўных з партыйнымі і грамадскімі арганізацыямі горада Масквы 6 лістапада 1944 года і Загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага Маршала Совецкага Саюза таварыша Сталіна ад 7 лістапада 1944 года.

Тыраж брашуры—50 тысяч экземпляраў.

Ад Совецкага Інформбюро

АПЕРАТЫЎНАЯ ЗВОДКА ЗА 14 ЛІСТАПАДА

На працягу 14 лістапада ў Венгрыі нашы войскі з баямі авалодалі горадам і чыгуначнай станцыяй НАДЗЬКАТА, а таксама занялі больш 30 другіх населеных пунктаў і сярод іх ХЕВЕШВЕЗЕКЕНЬ, ПУСТА, ЧАС, СЕНТМАРТОНКАТА, ТАПІОШАГ, УРЫ, ПЕЦЕРЫ і чыгуначныя станцыі НАДЗЬХАЛОМ, СЕНТМАРТОНКАТА. На поўдні ад Будапешта нашы войскі ліквідавалі плацдарм праціўніка на ўсходнім беразе ракі Дунай, заняўшы пры гэтым горад і чыгуначную станцыю ШОЛЬТ і населены пункт ДУНАЭДЗЬХАЗА.

У баях з 10 па 13 лістапада на тэрыторыі Венгрыі нашы войскі ўзялі ў палон 3.600 нямецкіх і венгерскіх салдат і афіцэраў.

Такім чынам з 8 па 13 лістапада ў баях на тэрыторыі Венгрыі нашымі войскамі ўзята ў палон 7.700 нямецкіх і венгерскіх салдат і афіцэраў.

На другіх участках фронта — пошукі разведчыкаў.

За 13 лістапада нашы войскі падбілі і знішчылі 18 нямецкіх танкаў. У паветраных баях і агнём зянітнай артылерыі збіт 21 самалёт праціўніка.

* * *

У Венгрыі нашы войскі, пераадольваючы супраціўленне праціўніка, з баямі прасоўваліся ўперад. На поўнач ад горада Сольнок немцы падкінулі свежыя пяхотныя часці і значную колькасць самаходных гармат. На працягу дня яны прадпрынялі некалькі бясплодных контратак, у ходзе якіх страцілі 16 танкаў і больш 600 сваіх салдат і афіцэраў.

На поўнач ад горада Цэглед нашы пяхотныя і кавалерыйскія злучэнні ў выніку ўпорных баёў выбілі гітлераўцаў з горада Надзьката — вельмі ўмацаванага вузла супраціўлення праціўніка на подступах да венгерскай сталіцы. На полі бою асталіся сотні варожых трупаў. Захоплены трафеі, у тым ліку 18 палявых і 14 зянітных гармат, 25 мінамётаў, некалькі складаў з боепрыпасамі і ваенная маёмасцю.

Учора і сёння адбываліся жорсткія баі ля ракі Дунай, на захад ад горада Кечкемет. У гэтым раёне праціўнік утрымліваў у сваіх руках плацдарм на ўсходнім беразе Дуная. Вельмі ўмацаваўшы горад Шольт і буйны населены пункт Дунаэдзьхаза, немцы разлічвалі ў зручны момант ударыць ва фланг нашым войскам, якія вядуць баі на подступах да Будапешта. Совецкія часці нанеслі праціўніку раптоўны ўдар і ўварваліся ў горад Шольт. Варожы гарнізон знішчан. Сотні нямецкіх і венгерскіх салдат, якія прабавалі пераправіцца праз Дунай, патанулі ў рацэ. Ліквідаваўшы плацдарм праціўніка на ўсходнім беразе Дуная, нашы войскі захапілі вялікія трафеі. Узята ў палон 1.200 гітлераўцаў.

Наша авіяцыя падтрымлівала дзеянні наземных войск і наносіла ўдары па танках, жывой сіле і артылерыйска-мінамётных батарэях праціўніка. У паветраных баях за дзень совецкія лётчыкі збілі 3 бамбардыроўшчыкі і 14 нямецкіх знішчальнікаў.

* * *

На паўднёвым захадзе ад горада Остраленка група нашых разведчыкаў, пад пакровам цемнаты, прарабіла праходы ў мінных палях і пранікла ў размяшчэнне праціўніка. У выніку імклівай атакі совецкія байцы разграмілі баявую ахову немцаў. Захапіўшы палонных, нашы разведчыкі ў добрым стане вярнуліся ў сваю часць. На другім участку артылерысты Н-скай часці разбурылі бліндаж, разбілі палявую гармату і тры станкавыя кулямёты праціўніка. Апрача таго, падаўлен агонь некалькіх агнявых пунктаў немцаў.

* * *

На 1-м Украінскім фронце адбывалася артылерыйска - мінамётная перастрэлка і пошукі разведчыкаў. Група разведчыкаў на чале са старшым лейтэнантам Макаравым зрабіла паспяховую вылазку ў размяшчэнне немцаў. Разведчыкі скрытна падабраліся да варожых пазіцый і захапілі станкавы кулямёт і двух нямецкіх кулямётчыкаў. Разведвацельны атрад старшага лейтэнанта Тіханава на працягу ночы знішчыў 8 гітлераўцаў і захапіў палоннага. Снайперы Н-скай часці таварышы Шыданоўскі, Камкарадзе, Арэр'еў і Міхаузаў за тры дні знішчылі 30 нямецкіх салдат і афіцэраў.

Група нашых лётчыкаў пад камандаваннем гвардыі капітана Крацінава атакавала нафтабазу праціўніка. На тэрыторыі базы ўзнік вялікі пажар. Гарэлі цыстэрны з гаручым і службовыя будынкі.

* * *

За час баёў у Карпатах войскі 4-га Украінскага фронта нанеслі цяжкія страты 1 венгерскай арміі. Праціўнік страціў забітымі і палоннымі дзесяткі тысяч сваіх салдат і афіцэраў. У раёне аднаго сяла ўзята ў палон група венграў у саставе 384 салдат, 14 унтэр-афіцэраў і двух афіцэраў 2 горна-стралковай брыгады. Палонны старшы лейтэнант доктар Тіханер Кіш заявіў: «Наша брыгада нагалаву разбіта. Некалькі дзён мы блукалі па лясах, мітусіліся з боку ў бок, як цкаваныя звяры. Немцы абяцалі нам прыслаць танкі і як заўсёды ашукалі. Каб выратаваць сябе, венграм неабходна хутчэй парваць з немцамі».

На другім участку ўзят у палон камандзір 3 батальёна 22 палка 6 венгерскай пяхотнай дывізіі капітан Ласло Бордаш, яго ад'ютант Аурэлі і група салдат. Палонны капітан заявіў: «Венгерскія часці стаяць перад катастрофай. Адзіны разумны для іх выхад — перайсці на бок Чырвонай Арміі і разам з ёю змагацца супроць немцаў».

У гэтым-жа раёне на наш бок перайшлі 95 салдат і тры афіцэры 1 роты 10 венгерскага горна-стралковага батальёна. Камандзір гэтай роты старшы лейтэнант Міклош Берэнд расказаў: «З шаснаццаці афіцэраў батальёна толькі адзін капітан Тімор прысягнуў «ураду» нямецкага стаўленіка Салашы. Я і ўсе астатнія афіцэры катэгарычна адмовіліся гэта зрабіць. Мы лічым, што толькі неадкладны разрыў з Германіяй можа выратаваць Венгрыю ад гібелі».

Прыбыццё ў Маскву дэлегацыі горада Варшавы

13 лістапада ў Маскву прыбыла дэлегацыя горада Варшавы.

У саставу дэлегацыі ўваходзяць: прэзідэнт горада Варшавы М. Спыхальскі і прадстаўнікі Рады Нарадовай і «Нацыянальнага Совета» Варшавы В. Цудны, В. Мальчынскі, І Кавальская.

На вакзале дэлегацыя была сустрэта намеснікам старшыні Массовета тав. М. Ясновым, намеснікам каменданта г. Масквы палкоўнікам Н. Грэбеншчыкавым, в. а. прадстаўніка Польскага Камітэта Нацыянальнага Вызвалення ў СССР панам С. Ендрыхоўскім і др.

Дзяржаўная дапамога маці і дзіцяці

Совет Народных Камісараў СССР прыняў пастанову аб расшырэнні сеткі дзіцячых устаноў і палепшанні медыцынскага і бытавога абслугоўвання жанчын і дзяцей.

У гарадах, рабочых пасёлках, на чыгуначным і водным транспарце, у сельскіх мясцовасцях значна павялічваецца сетка радзільных дамоў, кансультацый, дзіцячых садоў, яслей, малочных кухань. Ужо ў бягучым годзе павінен быць адкрыт рад новых дзіцячых устаноў і павялічана колькасць месц у існуючых.

У 1945 годзе колькасць ложкаў у радзільных дамах і аддзяленнях рашана давесці да 91.200, у дамах дзіцяці—да 43.700. У дзіцячых садах будзе выхоўвацца звыш 2 мільёнаў дзяцей, у яслях —каля мільёна. Уводзіцца кругласутачнае прабыванне дзяцей у яслях. Расшыраецца сетка дзіцячых і жаночых кансультацый, дамоў маці і дзіцяці і г. д.

Адпушчаны буйныя сродкі і матэрыялы на будаўніцтва і рамонт дзіцячых устаноў. Усе памяшканні гэтых устаноў, занятыя не па прамому прызначэнню, павінны быць да 1 лістапада 1945 года вызвалены і адрамантаваны.

Прамысловым наркаматам даручана вырабіць баваўняныя тканіны, валёнкі, скураны абутак, трыкатажныя і іншыя вырабы для забеспячэння дзяцей, якія знаходзяцца ў дзіцячых установах і ў патранаце.

(ТАСС).

ЗВАРОТ СОВЕЦКІХ ГРАМАДЗЯН НА РАДЗІМУ

МУРМАНСК, 14 лістапада. (ТАСС). Сюды гэтымі днямі прыбылі з Англіі два транспарты, на барту якіх знаходзілася каля 10 тысяч вызваленых саюзнымі войскамі совецкіх ваеннапалонных і грамадзян СССР, адпраўленых нямецкімі захопнікамі на фашысцкую катаргу. Сярод рэпатрыіраваных совецкіх грамадзян—жанчыны і дзеці-сіраты, бацькі якіх замучаны нямецкімі катамі.

Прыбыўшых цёпла сустрэлі прадстаўнікі Соўнаркома СССР па справах рэпатрыяцыі совецкіх грамадзян з Германіі і акупіраваных ёю краін, а таксама прадстаўнікі мясцовых совецкіх органаў і грамадскасці. Хвалюючай была сустрэча совецкіх грамадзян, якія вярнуліся з фашысцкай няволі, з прапоўнымі Мурманска. Стыхійна ўзнік мітынг. Адзін за другім узніміліся на імправізіраваную трыбуну совецкія грамадзяне, гвалтоўна адарваныя нямецкімі ізвергамі ад Радзімы, і выказвалі сваю ўсхваляваную ўдзячнасць совецкаму ўраду і таварышу Сталіну за клопаты аб іх.

— Гэта самы шчаслівы дзень у маім жыцці,—гаворыць са слязьмі на вачах пажылая жанчына. —Мы ведалі,—усклікае яна,—што радзіма памятае аб нас, што Чырвоная Армія вырве нас з фашысцкага рабства.

І вось нарэшце мы дома.

Выступае былы ваеннапалонны. Ён гаворыць аб жудасных здзеках і катаваннях, якім падвяргаюцца совецкія байцы, якія ў выніку цяжкіх раненняў аказаліся ў нямецкіх лагерах для ваеннапалонных. Выступаючы выказвае шчырае жаданне ўсіх сваіх таварышоў — неадкладна вярнуцца ў рады Чырвонай Арміі і са зброяй у руках помсціць гітлераўскім катам за гора і пакуты, прычыненыя нашаму народу.

Мясцовыя совецкія органы праявілі вялікія клопаты аб рэпатрыіраваных совецкіх грамадзянах. Іх забяспечылі харчаваннем і жыллём. Совецкія людзі, якія зноў вярнуліся на Радзіму, праяўляюць велізарны інтарэс да радасных падзей на фронтах Айчыннай вайны, да жыцця Совецкага Саюза. Затаіўшы дыханне, слухалі яны 6 лістапада даклад Старшыні Дзяржаўнага Камітэта Абароны таварыша Сталіна на ўрачыстым пасяджанні Маскоўскага Совета дэпутатаў працоўных сумесна з прадстаўнікамі партыйных і грамадскіх арганізацый горада Масквы.

Рэпатрыіраваныя совецкія грамадзяне групамі раз'язджаюцца па родных месцах. Дзеці-сіраты, бацькі якіх загінулі ад рук нямецкіх захопнікаў, размяшчаюцца ў дзіцячых дамах.

Перадавая МТС

МІР, 14 лістапада. (БЕЛТА). Мірская МТС па праву лічыцца перадавой у раёне. Калектыў яе больш чым у два разы перавыканаў план па ўздыму зяблівы, на 193 процанты выканаў заданне па малацьбе. Лепшыя брыгады трактарыстаў, якімі кіруюць т. т. Пінемаш, Герасімчык, Развадоўскі, у два-тры разы перавыконваюць нормы.

Сіламі калектыва рабочых ужо адноўлена 35 трактараў, 16 аўтамабіляў і лакамабіляў, 50 малатарань.

Адказваючы на гістарычны даклад таварыша Сталіна, трактарысты, камбайнеры і механікі абавязаліся ў зімовы перыяд поўнасцю адрадзіць машынатрактарны парк МТС і зрабіць яго такім, якім ён быў да вайны.

ПАСКОРЫЛІ РУХ ПАЯЗДОЎ

МАГІЛЕЎ, 14 лістапада. (БЕЛТА). Чыгуначнікі Магілеўскага вузла з велізарным натхненнем сустрэлі даклад таварыша Сталіна аб 27-й гадавіне Кастрычніцкай Соцыялістычнай рэволюцыі. Работнікі вузла абавязаліся па-крываносаўску вадзіць паязды да лініі фронта, узорна правесці падрыхтоўку да зімы. Рамонтнікі абавязаліся датэрмінова закончыць выкананне лістападаўскага і снежаньскага планаў па рамонту паравозаў. Работнікі станцыі сталі на сталінскую вахту і шляхам скарасной апрацоўкі саставаў значна скарацілі прастой вагонаў.

Атрымліваюць пашпарты гатоўнасці да зімы

ГОМЕЛЬ, 14 лістапада. (БЕЛТА). На Беларускай чыгунцы пачалося ўручэнне пашпартоў гатоўнасці да зімы прадпрыемствам, паравозным брыгадам і калектывам цэхаў, якія завяршылі падрыхтоўку да работы ў зімовых умовах.

Першым на чыгунцы атрымаў пашпарт гатоўнасці да зімы калектыў Асіпавіцкага вагоннага ўчастка. Ён паспяхова падрыхтаваў да зімы ўсе цэхі, прывёў ва ўзорны парадак і ўцяпліў жыллёвыя памяшканні, правёў нарыхтоўку дроў, неабходнай гародніны і бульбы для грамадскага харчавання. Асіпавіцкія вагоннікі ўжо другі месяц трымаюць пераходны чырвоны сцяг чыгункі. Атрымліваючы пашпарт гатоўнасці да зімы, калектыў вагоннікаў абавязаўся чотка працаваць у зімовых умовах, выканаць план рамонту за лістапад на 110 процантаў.

У Гомельскім аддзяленні першым атрымаў пашпарт гатоўнасці да зімы калектыў станцыі Рэчыца. Тут адрамантавалі і ўцяплілі памяшканне вакзала, стрэлачных пастоў, нарыхтавалі неабходную колькасць шчытоў для затрымання снегу.

Пашпарт гатоўнасці да зімы ўручан таксама паравознаму дэпо, дзе начальнікам т. Нікіцін, і раду іншых калектываў.

АБЛАСНАЯ НАРАДА ПА ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

БАБРУЙСК, 14 лістапада. (БЕЛТА). Тут адбылася абласная нарада па жывёлагадоўлі. На нарадзе прысутнічалі сакратары райкомаў партыі, загадчыкі раённымі зямельнымі аддзеламі, загадчыкі жывёлагадоўчымі фермамі калгасаў і соўгасаў і раённыя зоатэхнікі.

З дакладам аб задачах развіцця жывёлагадоўлі обласці выступіў сакратар абкома партыі тав. Гласаў.

БАРАНАВІЦКАЯ ОБЛАСЦЬ ЗАКОНЧЫЛА АБМАЛОТ УРАДЖАЮ

БАРАНАВІЧЫ, 14 лістапада. (БЕЛТА). Калгасы і аднаасобныя гаспадаркі Баранавіцкай обласці, першымі ў рэспубліцы выканаўшы план зяблевага ворыва, закончылі абмалот збожжавых культур. Раней устаноўленага тэрміну завяршылі абмалот калгаснікі і сяляне Несвіжскага раёна і поўнасцю разлічыліся з дзяржавай па ўсіх відах паставак.

У СТАРАЖЫТНЫМ БЕЛАРУСКІМ ГОРАДЗЕ НЕСВІЖЫ

Вялікія разбурэнні нанеслі нямецкія захопнікі помнікам старыны старажытнага беларускага горада Несвіжа. У вядомым замку, пабудаваным у другой палавіне XVI стагоддзя, гітлераўцы арганізавалі салдацкі пастой. Бязлітасна разбуралі і пераабсталёўвалі яны тут залы і пакоі. Моцна пацярпелі Слуцкія трыумфальныя вароты, якія з'яўляюцца часткай крэпасных умацаванняў горада.

Асабліва вялікія разбурэнні нанеслі фашысцкія варвары Георгіеўскай царкве, касцёлу і сінагоге. Яны сарвалі з гэтых будынкаў дахі, артылерыйскімі снарадамі прабілі сцены.

З першых дзён вызвалення Несвіжа пачалося аднаўленне помнікаў старыны. Сюды прыязджала група архітэктараў, мастацтваведаў і мастакоў.

На аднаўленчыя работы райвыканком адпусціў будаўнічы матэрыял. Зараз ужо закончан рамонт касцёла. Вядзецца аднаўленне Георгіеўскай царквы і трыумфальных варот. (БЕЛТА).

ВЫВУЧАЮЧЫ ДАКЛАД ПРАВАДЫРА...

Як толькі былі атрыманы свежыя газеты з дакладам таварыша Сталіна, студэнты настаўніцкага інстытута, закончыўшы заняткі, зноў сабраліся ў аудыторыю. Былы партызан, студэнт першага курса Павел Лепіла ўзяў газету і пачаў чытаць. Затаіўшы дыханне, слухала яго перапоўненая аудыторыя. Кожны з прысутных імкнуўся не прапусціць ніводнага слова правадыра.

«...Пяты ўдар быў нанесен немцам у чэрвені — ліпені гэтага года, калі Чырвоная Армія нагалаву разбіла нямецкія войскі пад Віцебскам, Бабруйскам, Магілевам і завяршыла свой удар акружэннем 30-ці нямецкіх дывізій пад Мінскам. У выніку гэтага ўдару нашы войскі: а) поўнасцю вызвалілі Беларускую Совецкую Рэспубліку»... —голасна і выразна гучаць словы чытача і ў памяці студэнтаў паўстаюць усім памятныя, хвалююча - радасныя дні, якіх з нецярпеннем тры гады чакалі беларусы ад малога да вялікага. І не проста чакалі, а актыўна дапамагалі са зброяй у руках пракладаць арміі-вызваліцельніцы шлях на захад.

«...Калі Чырвоная Армія змагла паспяхова выканаць свой абавязак перад Радзімай і выгнала немцаў з межаў совецкай зямлі, то яна зрабіла гэта дзякуючы таму, што яе беззаветна падтрымлівала з тылу ўся наша краіна, усе народы нашай краіны. Самаадданая праца ўсіх совецкіх людзей—рабочых, сялян, інтэлігенцыі, таксама як і кіруючая дзейнасць нашых дзяржаўных і партыйных органаў праходзіла ў прайшоўшым годзе пад сцягам — усё для фронта» — голасна гучаць гэтыя словы, і сэрца кожнага слухача напаўняецца вялікай, хвалюючай радасцю і гордасцю за свой народ, сваю радзіму.

У словах правадыра кожны чытаў высокую ацэнку працы сваіх бацькоў, братоў і сясцёр, якія, працуючы на адноўленых прадпрыемствах, у калгасах і ўстановах, робяць усё магчымае для перамогі над ворагам. І кожны студэнт глыбока разумеў, што і яны павінны зрабіць таксама ўсё магчымае, каб хутчэй знішчыць немца-звера.

... Калі чытчык скончыў чытаць, некалькі хвілін стаяла напружаная цішыня, кожны быў пад уражаннем прачытанага. Потым цішыня абудзілася зразу некалькімі галасамі. Слухачы жадалі падзяліцца сваімі думкамі, уражаннямі.

— З вялікай прастатой і яскравасцю,—гаворыць з хваляваннем студэнтка, былая партызанка, Вера Жукоўская,—таварыш Сталін у сваім дакладзе паказаў ход і перспектывы Айчыннай вайны, паказаў самаадданую гераічную працу совецкага народа, доблесць і мужнасць нашых воінаў. Надыйшоў апошні момант расплаты з гітлераўскімі катамі. Воіны Чырвонай Арміі разам з воінамі саюзных армій даб'юць іх ва ўласнай бярлозе. Мы павінны зрабіць усё магчымае, каб дапамагчы нашай Чырвонай Арміі ў яе гераічнай барацьбе. Я абавязваюся добра вучыцца і актыўна ўдзельнічаць у адноўленні нашага горада.

Студэнтка Валя Зубкоўская гаворыць:

— Калі ўспамінаеш нядаўняе мінулае — мурашкі па целу прабягаюць. Немцы вешалі, расстрэльвалі, палілі, марылі голадам, адпраўлялі на катаргу ў Германію. Яны застрэлілі маю маці і сястру. Я помсціла немцам у партызанскім атрадзе. На маіх вачах немцы спалілі вёскі Граду, Навішча, Лочын, Пухавіцкага раёна. У агні згарэла некалькі сот дзяцей, жанчын і старыкоў. Немцы лютавалі перад смерцю. Яны адчувалі свой блізкі канец і зараз ён прыходзіць.

Якія мы з вамі шчаслівыя! Мы вольныя, мы зноў вучымся ў інстытуце. Хутка будзем настаўнікамі. Каму мы абавязаны ўсім гэтым? Таварышу Сталіну. Гэта ён нам выратаваў жыццё. Гэта ён нам даў права на вучобу, на шчаслівае будучае. Вялікае дзякуй роднаму Сталіну!

...Позна разыходзіліся студэнты дадому, уносячы ў думках і ў сэрцы словы правадыра.

С. СВІРЫДАЎ.

ШЫРЫЦЦА КІНОСЕТКА

Па Гомельскай вобласці працуе сем гукавых кінотэатраў: у Рэчыцы, Уваравічах, Ветцы, Рагачове, Добрушы, Чачэрску і Нова-Беліцы. Сем нямых кіноперасовак абслугоўваюць сельскае насельніцтва 10 раённаў вобласці. Ва ўрачыстай абстаноўцы ў дні кастрычніцкіх свят адкрыты кінотэатры ў Церахоўцы і Буда-Кашалёве. Заканчваецца аднаўленне кінотэатра ў Лоеве. Да канца года будзе атрымана яшчэ 5 новых стацыянарных установак і 10 кіноперасовак.

Насельніцтва з вялікай цікавасцю глядзіць новыя совецкія фільмы. Толькі ў жніўні месяцы гарадскія тэатры наведала больш за 31 тысячу гледачоў. Нямыя кіноперасоўкі за гэты час абслужылі па вёсцы каля 4 тысяч чалавек. У верасні месяцы лік сельскіх гледачоў дасягнуў больш 4 тысяч чалавек. Гарадскія кінотэатры наведала 30 тысяч чалавек.

Перадавым кінотэатрам па Гомельскай вобласці заслужана лічыцца Рэчыцкі (начальнік міжрайаддзела кінофікацыі тав. М. Нікіцін). Тэатр не мае зрываў па віне кіномеханіка С. Гусарава. Чутнасць і рэзкасць гука заўсёды добрыя. Пры тэатры працуюць дзве кіноперасоўкі. Толькі за апошні час сельскі глядач пазнаёміўся з 9 новымі кінокарцінамі: «Народный мститель», «Два бойца», «Актриса», «Во имя родины» і інш. За месяц дан 21 кіносеанс. Асаблівай добрасумленнасцю ў рабоце вызначаецца кіномеханік нямой перасоўкі тав. В. Асадчанка. Ён штомесячна дае не менш 20 сеансаў і заўсёды перавыконвае фінансавы план.

У 1945 годзе ў горадзе Гомелі будзе адноўлен кінотэатр імені Калініна на 1.200 месц. Дзяржава адпусціла на адноўленне гэтага тэатра 2.100 тысяч рублёў. 600 тысяч рублёў будзе выдаткавана ў гэтым годзе. На рамонт і аднаўленне кінотэатраў у Рэчыцы, Жлобіне і Уваравічах адпушчана па 50 тысяч руб.

У 1945 годзе кожны раён вобласці будзе мець свой кінотэатр.

Д. ДМІТРЫЕВА.

На аднаўленні Мінска

ДЗЁННЫЯ НОРМЫ ПЕРАВЫКОНВАЮЦЦА

Калектыў Мінскага мясакамбіната перадкастрычніцкае абавязацельства па адбудове горада перавыканаў. Гістарычны даклад Старшыні Дзяржаўнага Камітэта Абароны таварыша Сталіна натхніў працоўных на новыя працоўныя поспехі. У першы-ж выхад пасля мітынга рабочыя, хатнія гаспадыні паказалі новы вытворчы ўздым на адбудове горада. Дзённую норму яны выканалі па 270 процантаў.

Брыгадзе таварыша Яравога было даручана разабраць цэлымі дэталямі 4-павярховы дом на вуліцы Свярдлова, дастаць цэлую цэглу. Задача была нялёгкая. Па ініцыятыве саміх рабочых быў падрыхтаван інструмент: лябёдка, тросы, кліпкі, кіркі, рыдлёўкі і г. д. Увесь калектыў працаваў з натхненнем, энергічна, не адчуваючы стомы. Два дні па 9—10 гадзін ішла работа, 9 лістапада брыгада выканала дзённую норму на 1.809 процантаў, на другі дзень—на 2.570 процантаў.

Рабочы гэтай брыгады былы партызан тав. Марчанка заявіў:

— Наша брыгада працуе па-франтавому. Мы ўжо адпрацавалі 270 чалавекагадзін. Асталося адпрацаваць у гэтым месяцы 75 гадзін. Мы ўзялі абавязацельства адпрацаваць звыш плана яшчэ 80 гадзін.

К. НІКАЛАЕЎ.

ВА УНІВЕРСІТЭЦКІМ ГАРАДКУ

12 лістапада ва Універсітэцкім гарадку адбыўся нядзельнік. Студэнты і выкладчыкі, дацэнты і прафесары прыйшлі ў гэты дзень на работу з рыдлёўкамі, кіркамі, насілкамі. Брыгада за брыгадай накіроўваюцца на загадзя вызначаныя ўчасткі. Брыгада пад кіраўніцтвам выкладчыка Моркаўкі ідзе на разборку руін памяшкання на Ленінградскай вуліцы. Брыгада, якой кіруе студэнт 5 курса хімічнага факультэта тав. Комлік, накіроўваецца ў спалены фашыстамі хімічны корпус. Яна будзе ачышчаць калідор і склеп ад абломкаў. Разыходзяцца па сваіх аб'ектах і іншыя брыгады.

Дружна пачынаецца работа. Праз гадзіну-дзве ў кожнай брыгадзе ўзорнай працай вызначаюцца лепшыя. У авангардзе на аднаўленні, як заўсёды, комуністы. Трэба адзначыць у першую чаргу комуністаў Турэцкага, Макарэвіча, Гордзіну, Фрыдман, Арцем'еву. Паступова расчышчаецца месца. Бясформеная груда вугалю і бітай цэглы знікае, на расчышчаным месцы астаецца толькі ўцалеўшы падмурак. Ён добра захаваўся і яшчэ спатрэбіцца для будаўніцтва.

Паабапал расчышчанага месца выраслі штабялі прыгоднай цэглы, кучы бітага шчобня. Гэта матэрыял, які пойдзе на адбудову сталіцы.

Пасля сканчэння работы падводзяцца вынікі. Прыёмшчык прымае ўчастак. Лепшыя вынікі паказала брыгада студэнтаў, якой кіруе тав. Моркаўка. 21 чалавек выбралі 2.300 цэлых цаглін і 3,5 кубічнага метра бітай цэглы.

І. МЕЛЕ,
студэнт 4 курса.

Чалгаснаму каню—клапатлівага гаспадара

ХАЛОПЕНІЧЫ. (Кар. «Звязды»). Старшыня калгаса «Профінтэрн», Траянаўскага сельсавета, Цімафей Гаспадарык з самага пачатку аднаўлення калгаса звяртае асаблівую ўвагу на догляд коней. У часе адступлення немцаў Цімафей Гаспадарык разам з калгаснікамі Міхаілам Баярыным і Пятром Гаспадарык схавалі ў лесе ад немцаў лепшых коней. Але ўсіх коней схаваць усё-ж не ўдалося. Пасля выгнання акупантаў у калгасе асталося многа хворых і знясіленых коней. На пасаду конюхаў тут вылучылі лепшых людзей, якія любяць сваю справу.

У добрым стане знаходзіцца ў калгасе збруя, якая падагнана да кожнага каня. Калгас даўно падрыхтаваў да зімы канюшні. У выніку ўсе коні сталі сытыя і працаздольныя.

Але так абстаяць справы ў нямногіх калгасах. У суседнім калгасе імені Варашылава, дзе старшынёй тав. Кавалёнка, з 32 коней—19 слабасільных і хворых каростай. Старшыня гэтай арцелі не клапоціцца аб тым, каб хутчэй вылячыць коней. Падборам конюхаў у гэтай арцелі не займаюцца, а таму ёсць многа фактаў негаспадарлівых, варварскіх адносін да коней.

Мала праяўляе клопатаў аб конях і кіраўнік калгаса «Комунар». У калгасе да гэтага часу не ўпарадкаваны такі каштоўны корм, як мякіна, якая гніе. Безгаспадарліва выдаткоўваецца і сена.

Г. БАЯРЫН.

Адданы сын радзімы

ПІСЬМО У РЭДАКЦЫЮ

Да акупацыі нямецкімі захопнікамі горада Жлобіна Шашукоў Сяргей Філіпавіч працаваў наглядчыкам па тэлефонна-тэлеграфнай станцыі. Калі ў 1941 годзе ворагі набліжаліся да горада, Шашукоў частку каштоўнай маёмасці станцыі паспеў схаваць у зямлю. Але многа маёмасці асталося не схаванай.

У часе акупацыі, не гледзячы на свой 60-гадовы ўзрост, Сяргей Філіпавіч паступае на работу на станцыю і, выкарыстоўваючы ўсякія магчымасці, выносіць адтуль астаўшуюся маёмасць і хавае яе.

Ён расказвае:

— Я ведаў, што хутка прыдзе наша вызваліцельніца—Чырвоная Армія і я буду мець чым яе сустракаць.

Наступіў радасны дзень вызвалення ад фашысцкіх грабежнікаў. Пачалася ўпорная работа па аднаўленню разбуранай гаспадаркі на чыгуначным вузле і ў горадзе. У першую чаргу неабходна было аднавіць сувязь. Тут вось і прыгадзілася тое, што тры гады беражна хаваў тав. Шашукоў.

Для аднаўлення сувязі ён перадаў 10 генератарных шчытоў з прыборамі, пяць уводных шчытоў з рубільнікамі, 10 тэлефонных апаратаў, апарат Марзе, 6 вымяральных прыбораў, 40 кандэнсатараў, 50 рэфузораў для радыёпунктаў—1.000 кілограм сталістага дроту, 3.000 кілограм жалезнага дроту, 500 кілограм меднага купаросу, 4 незгараемыя касы і многа іншай каштоўнай маёмасці.

Зараз тав. Шашукоў працуе на старым месцы і, не пакладаючы рук, дапамагае аднаўляць гаспадарку, разбураную нямецкімі фашыстамі.

Тэхнік-лейтэнант
А. САМУЕВІЧ.

За новыя працоўныя подвігі

БРЭСТ, 14 лістапада. (БЕЛТА). У цэхах, дэпо, дыстанцыях чыгуначнага вузла адбыліся шматлюдныя мітынгі, прысвечаныя дакладу таварыша Сталіна. На сходзе рабочых механічнага цэха агульную думку прысутных выказаў майстар Скляраў:

— Праўдзівыя словы правадыра аб слаўных перамогах Чырвонай Арміі, аб гераічнай-рабоце працоўных Совецкага тыла натхняюць нас на новыя працоўныя подвігі. Мы яшчэ больш узмацнім дапамогу фронту, датэрмінова выканаем план лістапада месяца.

Калектыў паравознага дэпо абавязаўся выпускаць штомесячна з рамонту па тры паравозы звыш плана, эканоміць паліва не ніжэй пяці процантаў.

Свае абавязацельствы чыгуначнікі з чэсцю выконваюць. Токар Сухоцкі, стаўшы на стаханаўскую вахту, у першы-ж дзень перавыканаў заданне ў чатыры разы. Стаханавец кузнечнага цэха Церахунь узняў прадукцыйнасць працы да 300 процантаў.

СТАХАНАЎСКАЯ ПРАЦА АДГУКНЕЦЦА ГРОМАМ НАД ЛОГАВАМ ФАШЫСЦКАГА ЗВЕРА

БАБРУЙСК. На прадпрыемствах горада з вялікім уздымам прайшлі сходы, прысвечаныя дакладу таварыша Сталіна. Рабочыя, служачыя і інжынерна-тэхнічныя работнікі бяруць на сябе канкрэтныя абавязацельствы па павышэнню прадукцыйнасці працы. Начальнік электрацэха лесакамбіната т. Цвірко заявіў:

— Таварыш Сталін сказаў, што фашысцкі звер будзе знішчан у недалёкім будучым. Так яно і будзе. Стаханаўская праца совецкіх людзей адгукнецца громам над логавам фашысцкага звера.

Калектыў лесакамбіната ўзяў на сябе абавязацельства поўнасцю выканаць вытворчы план чацвертага квартала да 5 снежня.

Многія стаханаўцы камбіната выконваюць па паўтары нормы.

На аднаўленні Мінска. Фото А. Карніцкага.

ГОД РАШАЮЧЫХ ПЕРАМОГ

У 1944 годзе Чырвоная Армія ўвянчала сябе лаўрамі перамог, бясспрыкладных па грандыёзнасці і велічы, па глыбіні стратэгічнага замысла і майстэрству яго выканання.

Гісторыя войн ведае нямала прыкладаў бліскучых аперацый, але ніколі яшчэ ні адна армія не пакрывала свае сцягі славай перамог, якія следуюць няўхільна адна за другой у гіганцкай схватцы, роўнай якой не бывала. Ні адно войска не здзейсняла такога трыумфальнага шляху. Толькі Чырвонай Арміі выпала гістарычная чэсць упершыню здзейсніць такі воінскі подвіг.

Наступальныя аперацыі Чырвонай Арміі разгарнуліся ў гэтым годзе на нябачанай па абшырнасці арэне. Планамерна і паслядоўна прышоў у рух увесь фронт ад Ледавітага акіяна да Балкан. Караючы меч апусціўся на магутныя абарончыя збудаванні ворага. І, узламаны па частках, рухнуў увесь фронт нямецка-фашысцкай арміі па ўсходзе і паўднёвым усходзе Еўропы.

Гром грымнуў у студзені. Сакрушыўшы доўгачасовую абарону немцаў пад Ленінградам і Ноўгарадам, совецкія войскі адкінулі іх у Прыбалтыку і вызвалілі Ленінградскую вобласць. Наступны ўдар быў нанесен за сотні кіламетраў ад гэтага ўчастка — па Бугу. Разграміўшы нямецкія войскі, Чырвоная Армія адкінула іх за Днестр і вызваліла Правабярэжную Украіну.

Дарэмна германскае камандаванне прабавала прадугадаць раёны бліжэйшых наступальных аперацый Чырвонай Арміі і падрыхтавацца іх адбіць. Удар следаваў за ўдарам з нарастаючай сілай па самых нечаканых для праціўніка напрамках. Крым, Карэлія, Віцебск, Бабруйск, Магілеў, Львоў, Кішынёў — Яссы, Прыбалтыка, Карпаты, Венгрыя, Паўночная Фінляндыя...

Дробячым молатам абрушваліся гэтыя ўдары на ворага, разбіваючы ўшчэнт яго інжынерныя збудаванні, сакрушаючы і знішчаючы нямецкія палкі, дывізіі і цэлыя арміі. Дарэмна немцы прабавалі ўтрымацца на тылавых абарончых рубяжах, спыніць лавіну наступлення, прывесці ў парадак разбітыя часці, захаваць упраўленне войскамі. Не даючы непрыяцелю перадышкі, уладарна навязваючы яму сваю волю, бязлітасна б'ючы і знішчаючы жывую сілу ворага і яго ўзбраенне, совецкія войскі нястрымна ішлі на захад.

Зводкі Совінформбюро штодзённа паведамлялі аб сотнях і тысячах населеных пунктаў, вызваленых ад нямецка-фашысцкіх акупантаў. Чырвоная Армія зварочвала краіне сталіцы саюзных рэспублік, абласныя цэнтры, гарады і сёлы, лясы і нівы, рэкі і азёры. Фашысцкія гады былі вышвырнуты з раёнаў Карэла-Фінскай ССР, з тэрыторыі Беларусі, з земляў Совецкай Украіны, Малдавіі, з Прыбалтыкі. І, нарэшце, настала радасная гадзіна, калі ўся наша зямля, акупіраваная немцамі ў першыя два гады вайны, была ачышчана ад гітлераўскай погані.

Развіваючы наступленне, Чырвоная Армія перайшла граніцы вялікай совецкай дзяржавы. Нашы пабеданосныя войскі ўступілі на тэрыторыю Румыніі, Балгарыі, Венгрыі і, нарэшце, Германіі. Аказаўшыся на краю бездані, румыны, балгары і фіны запрасілі міру і павярнулі сваю зброю супроць немцаў. Завяршыўшы вызваленне роднай зямлі ад гітлераўскіх акупантаў, наша армія дапамагае зараз народам Польшчы, Югаславіі і Чэхаславакіі скінуць ярмо гітлераўскага рабства. Абстаноўка на фронце барацьбы з нямецка-фашысцкімі захопнікамі змянілася карэнным чынам.

Гістарычныя перамогі Чырвонай Арміі былі здабыты ў жорстких крывепралітных баях. Нам прышлося мець справу з вопытным і моцным праціўнікам. Адчуўшы на сабе магутнасць удараў Чырвонай Арміі, германскае камандаванне загадзя і старанна рыхтавалася да абароны захопленых рубяжоў. На совецка-германскім фронце летам гэтага года было сканцэнтравана да 200 нямецкіх дывізій. Выкарыстоўваючы натуральныя ўмовы мясцовасці, немцы пабудавалі на важнейшых напрамках доўгачасовую абарону, падмацаваную ўсімі дасягненнямі сучаснай фартыфікацыі.

Навучаныя горкім вопытам папярэдніх баёў, немцы не задавальняліся пабудовай магутных умацаваных палос на лініі фронта, яны будавалі сваю абарону на вялікую глыбіню, вымяраемую часам сотнямі кіламетраў, размяшчаючы па ўсёй прасторы ўмацаванні і войскі. Яны ўмацоўвалі берагі рэк, горныя хрыбты, ператваралі ў крэпасці гарады і населеныя пункты, будавалі шматлікія прамежкавыя рубяжы. Але крышчэчыя тараны нашага наступлення прабівалі наскрозь усю абарону праціўніка, дабіраючыся да самага сэрца германскай ваеннай машыны.

Совецкая зямля назаўсёды ачышчана ад гітлераўскіх людаедаў. Ажыццяўляючы планы Вярхоўнага Галоўнакамандавання, часці Чырвонай Арміі акружалі і ліквідавалі фашысцкія дывізіі, карпусы і групы. Бліскучыя аперацыі па акружэнню нямецкіх войск у раёне Віцебска, Бабруйска, Мінска, Брод, Кішынёва назаўсёды ўвойдуць у летапіс войн як класічныя ўзоры аператыўнага майстэрства, воінскага ўмення. Толькі ў гэтых раёнах былі перабіты дзесяткі фашысцкіх дывізій. Больш трыццаці дывізій Чырвоная Армія дакалачвае ў Прыбалтыцы!

У 1944 годзе немцы пацярпелі катастрафічныя паражэнні на совецка-германскім фронце. У выніку наступальных аперацый Чырвонай Арміі канчаткова разваліўся фашысцкі блок, і гітлераўская Германія пастаўлена перад прамой пагрозай немінучага поўнага разгрому. Такая задача аказалася па плячу толькі Чырвонай Арміі — самай магутнай і загартаванай сучаснай арміі.

У сваім загадзе ад 7 лістапада 1944 г. Вярхоўны Галоўнакамандуючы Маршал Совецкага Саюза таварыш Сталін указвае: **«У зімовых і летніх сражэннях прайшоўшага года Чырвоная Армія паказала ўзросшае воінскае майстэрства. Воіны Чырвонай Арміі ўмела ўзламвалі ўмацаваныя палосы праціўніка, імкліва праследвалі, акружалі і знішчалі ворага. У наступальных баях праявілася чоткае ўзаемадзеянне ўсіх родаў совецкіх войск, высокае майстэрства манеўра. Совецкія воіны загартаваліся ў сражэннях, навучыліся граміць і перамагаць ворага. Чырвоная Армія вырасла ў грозную сілу і пераўзыходзіць ворага сваім воінскім уменнем і баявой тэхнікай».**

На ўсіх аперацыях прайшоўшага года ляжыць адбітак сталінскага палкаводчага майстэрства, усе яны аб'яднаны адзіным стратэгічным планам Вярхоўнага Галоўнакамандавання. У серыі сакрушальных удараў, якія абрушыліся на ворага, паступова разгортваўся найглыбейшы стратэгічны замысел Вярхоўнага Галоўнакамандавання. Кожная аперацыя займала сваё месца ў ланцугу другіх. У той-жа час кожная з гэтых аперацый была самастойнай, арыгінальнай, якая посіць адбітак творчага генія.

Ваеннае майстэрства лічыць важнейшай умовай выйгрыша сражэння правільны выбар раёна нанясення галоўнага ўдару. Яшчэ ў 1920 годзе таварыш Сталін пісаў: «...Поспех, рашучая перамога, залежаць пярэдка ад удалага выбару раёна ўдару, ад удалага выбару таго раёна, адкуль вы маеце намер нанесці праціўніку і развіць далейшы галоўны ўдар». Найвялікшыя палкаводцы ўсіх часоў лічылі гэтую задачу самай цяжкай. Яна бліскуча вырашана ў аперацыях Чырвонай Арміі на працягу зімовай і летняй кампаній гэтага года.

На ўчастках прарыву скрытна сканцэнтроўваліся пераўзыходзячыя сілы, каласальная колькасць гармат, танкаў, самалётаў, машын. Увесь складаны арганізм снабжэння арміі перабудоўваўся на службу задуманай аперацыі. Магутныя рэзервы падпіралі першыя эшалоны наступаючых. І ў выніку справа не абмяжоўвалася прарывам фронта, а заўсёды даводзілася да рашучых вынікаў, да поўнага разгрому варожых групіровак.

На службу перамозе прыцягваліся ўсе сілы і сродкі. Дасканала спланіраванае і адначасова гібкае ўзаемадзеянне ўсіх родаў войск характэрна для кожнай аперацыі Чырвонай Арміі. Усе моцныя бакі той ці іншай зброі выкарыстоўваліся з найбольшай эфектыўнасцю і да канца. Цудоўная дзёрзкасць, якая вызначае наступальныя сражэнні совецкіх войск, смелы манеўр і тлумачацца якраз гэтай усебаковай падрыхтаванасцю і забяспечанасцю прадстаячых аперацый. Усё гэта памнажалася на вывучку і адвагу совецкіх воінаў.

Сумесныя ўдары Чырвонай Арміі і англа-амерыканскіх войск набліжаюць гадзіну канчатковага разгрому гітлераўскай Германіі. **«Логава фашысцкага звера абкладзена з усіх бакоў, і ніякія выкрутасы ворага не выратуюць яго ад немінучага поўнага разгрому».** (І. Сталін). Совецкія войскі ўжо ўступілі на нямецкую зямлю і пагражаюць Германіі з паўднёвага ўсхода, усхода і паўночнага ўсхода, арміі саюзнікаў насоўваюцца з захада і паўднёвага захада. Гітлераўская Германія знаходзіцца паміж молатам і наковальняй. За час летняга наступлення Чырвоная Армія прайшла з баямі ад 550 да 900 з лішнім кіламетраў. Цяпер нашы перадавыя часці знаходзяцца ад Берліна на адлегласці 550 кіламетраў.

«Цяпер за Чырвонай Арміяй астаецца яе апошняя заключная місія: давяршыць разам з арміямі нашых саюзнікаў справу разгрому нямецка-фашысцкіх армій, дабіць фашысцкага звера ў яго ўласнай бярлозе і ўзняць над Берлінам сцяг перамогі, — сказаў на ўрачыстым паседжанні Маскоўскага совета 6 лістапада вялікі Сталін. **—Есць падстава разлічваць, што гэтая задача будзе выканана Чырвонай Арміяй у недалёкім будучым».**

Дні крывавага гітлераўскага рэжыму злічаны. Чырвоная Армія і арміі нашых саюзнікаў занялі зыходныя пазіцыі для рашаючага наступлення на жыццёвыя цэнтры фашысцкай Германіі. Нішто не выратуе гітлераўскіх разбойнікаў ад суда справядлівасці, ад кары гісторыі. Войскі гераічнай Чырвонай Арміі гатовы да апошніх і рашучых баёў за таржаство нашай справядлівай справы. Кіруемыя геніяльным палкаводцам вялікім Сталіным, пабеданосныя совецкія дывізіі, разам з арміямі нашых саюзнікаў, дабіюць фашысцкага звера і ўзнімуць над Берлінам сцяг перамогі.

(Перадавы артыкул «Правды» ад 13 лістапада).

Строга выконваць закон аб усеагульным навучанні

Тры гады над зямлёй нашай роднай рэспублікі вісела цёмная хмара фашысцкай няволі. Тры гады гітлераўскія выродкі грабілі, разбуралі ўсё тое, што было створана нашым народам у выніку упорнай працы на працягу дзесяцігоддзяў. Яны спалілі, разбурылі цудоўныя квітнеючыя гарады і сёлы, ачагі совецкай культуры і навукі. Больш 6.000 адных толькі школ спалілі фашысцкія нягодніки на тэрыторыі нашай рэспублікі. Яны ўсялякім чынам імкнуліся пазбавіць нашу моладзь магчымасці атрымліваць адукацыю. «Каб быць рабом, не трэба адукацыі»,—гаварылі немцы, вызнаючы нашай моладзі лёс рабоў.

Геройная Чырвоная Армія пад геніяльным кіраўніцтвам Маршала Совецкага Саюза таварыша Сталіна вызваліла беларускі народ ад няволі і назаўсёды захавала сумазбродныя планы гітлераўцаў крывавых катаў. Совецкая дзетвора зноў атрымала права на вучобу.

Адразу-ж пасля вызвалення нашай краіны з-пад ярма нямецкіх захопнікаў у ўсіх раёнах і абласцях пачало адраджацца жыццё. З руін і папялішчаў узнімаюцца фабрыкі, заводы, калгасы, ачагі культуры і навукі. Зараз у рэспубліцы адноўлены і пачаты 9.800 школ, з іх пачатковых 8.076, няпоўных сярэдніх—1.525, сярэдніх — [illegible] дзе навучаецца 1.304 тысячы вучняў.

Нават у цяжкія гады Айчыннай вайны партыя і совецкі ўрад строга клапацілі за тым, каб абавязковае навучанне ў школах было ўсеагульным, захоплівала ўсё маладое пакаленне. На гэтым этапе пачатковай і сярэдняй школы праведзен рад мерапрыемстваў, якія спрыяюць дысцыпліне, паляпшаюць успаноўку вучобы і павышаюць патрабаванні і веды вучняў. 21 чэрвеня 1944 года Саўнарком СССР вынес вядомую пастанову: «Аб мерапрыемствах па паляпшэнню якасці навучання ў школе». Гэтымі мерапрыемствамі партыя і ўрад абяцаюць таго, каб кожны вучань, які вышаў са сцен школы, валодаў трывалымі ведамі і здолеў-бы гэтыя веды самастойна прымяніць на практыцы ў далейшай рабоце.

У большасці абласцей і раёнаў нашай рэспублікі, не гледзячы на цяжкую спадчыну, пакінутую нямецкімі акупантамі, закон аб усеагульным навучанні паспяхова ператвараецца ў жыццё. У Ветрулянскім раёне, Магілеўскай вобласці, школамі настаўнікаў і вучняў, пры актыўным дапамозе іх бацькоў, калгасаў, мясцовых партыйных і совецкіх арганізацый адноўлены ўсе школы. Тут зараз працуе 59 школ, у якіх навучаецца больш 8.000 дзяцей. Ні аднаго хлопчыка і дзяўчынкі ва ўзросце ад 7 да 15 год няма па-за сценамі школ, якія поўнасцю забяспечаны ўсім неабходным абсталяваннем і палівам. Пры кожнай школе створаны бацькоўскія камітэты, якія актыўна дапамагаюць настаўніцкім калектывам у паладжванні работы школ. На ініцыятыве настаўнікаў і бацькоў пры кожнай школе ствараюцца фонды усеагульнага навучання, якія разгарнулі сярод насельніцтва збор сродкаў для вучняў—сірат і дзяцей франтавікоў і партызан.

Ва ўсім гэтым вялікая заслуга работнікаў народнай асветы, партыйных і совецкіх арганізацый раёна, якія штодзённа клапоцяцца аб правядзенні ў жыццё закона аб усеагульным навучанні.

Школьныя заняткі ў поўным разгары. Кожны дзень настаўнікі выкладаюць сваім вучням праграмны матэрыял або паўтараюць з імі раней пройдзены. Вучні паступова авалодваюць ведамі і неабходнымі навыкамі.

Аднак у радзе месц многія дзеці ні разу не з'яўляліся на вучобу. У спісах Бярэзаўскага раёна Брэсцкай обласці дзяцей школьнага ўзросту ад 7 да 15 год налічваецца 8.093, а наведваюць школу толькі 6.451. 13 школ зусім на замку з-за адсутнасці настаўнікаў. Ні раёна, ні аблана, ні Наркомасветы БССР, ведаючы аб гэтым, не паклапаціліся забяспечыць школы настаўнікамі, стварыць для іх нармальныя ўмовы працы.

У Здзіцкім сельсавеце гэтага раёна на словах заг. раёна тав. Прохарава не працуе ні адна школа з прычыны адсутнасці памяшканняў. Сапраўды, у гэтым сельсавеце гітлераўскія бандыты спалілі амаль усе вёскі. Але пры належным клопатах работнікаў народнай асветы, мясцовых партыйных і совецкіх арганізацый, пры мабілізацыі грамадскасці на гэтую важную справу тут можна было-б даўно адкрыць школу. А што гэта можна зрабіць сведчыць такі прыклад. У вёсцы Нівішча Кабакоўскага сельсавета немцы таксама разбурылі школу. Але па ініцыятыве перадавых сялян і пры актыўнай падтрымцы сельсавета сіламі грамадскасці вёскі школа была адбудавана за два тыдні. Такія прыклады не адзінкавыя.

Значны процант дзяцей школьнага ўзросту не ахоплены школай у Баранавіцкай і Маладзечанскай абласцях. Тут таксама не створаны нармальныя ўмовы для работы школ. Так, у час праверкі інспектарам Наркомасветы Новакапліцкай школы (Вілейскі раён), было ўстаноўлена, што яе наведваюць 54 вучні, а астатнія 76 па розных прычынах не наведваюць, школа зусім не забяспечана палівам.

У далейшым такое становішча нецярпіма. Неабходна літаральна ў бліжэйшыя дні прыцягнуць у школы ўсіх дзяцей, якія яшчэ не навучаюцца. Трэба зараз-жа паклапаціцца аб школьных інтэрнатах, арганізаваць матэрыяльную дапамогу дзецям-сіратам, наладзіць у школах гарачае сняданне з тым разлікам, каб ні асеннее бездарожжа, ні зімовыя халады не прывялі да адсеву школьнікаў. Там, дзе яшчэ не працуюць школы, неабходна каб яны неадкладна распачалі работу. Райана, аблана і Наркомасветы павінны забяспечыць іх настаўнікамі, кнігамі, навучальнымі дапаможнікамі.

Нашы совецкія дзеці, выратаваныя з фашысцкай няволі, павінны быць ахоплены ўсеагульным навучаннем. Стварыць для гэтага ўсе неабходныя ўмовы — неадкладная задача работнікаў народнай асветы, партыйных і совецкіх арганізацый.

У КАЛГАСЕ «УДАРНІК ПЯЦІГОДКІ» АДНОЎЛЕНЫ 4 ФЕРМЫ

КАСЦЮКОВІЧЫ. Калгаснікі сельгаспрцелі «Ударнік пяцігодкі», Машаўскага сельсавета, вялікую ўвагу аддаюць аднаўленню грамадскай жывёлагадоўлі. Тут ужо адноўлена 4 фермы, на якіх налічваецца буйнай рагатай жывёлы—52 галавы, свіней—12, авечак 11 галоў і вадаплаваючай птушкі—52 штукі.

Папаўненне ферм ідзе за кошт кантрактацыі маладняка і птушкі ў калгаснікаў. Фермамі загадвае лепшая калгасніца Елізавета Іскарадава.





НА ВЫСТАЎЦЫ УЗОРАЎ ТРАФЕЙНАГА ЎЗБРАЕННЯ

Яшчэ нядаўна тут быў пустыр, ямы зарослыя бур'янам, кучы бітай цэглы, руіны разбураных дамоў. Тыповы след нямецкага гаспадарання ў горадзе! Гэты пустыр рукамі будаўнікоў ачышчан ад хламу, ператворан у роўную пляцоўку, якая абнесена прыгожай загарадай і азеленена кустамі акацый. На гэтай прыгожай пляцоўцы адкрыта выстаўка ўзораў трафейнага ўзбраення.

Ля цэнтральнага ўваходу на выстаўку, на высокім цэментным п'едэстале ўзвышаецца грозны совецкі танк. Над танкам, нібы чырвонакрылая птушка, развяваецца чырвоны сцяг, авеяны славай совецкай зброі. На п'едэстале высечан надпіс: «Хто да нас з мечам увойдзе, ад меча і загіне». Аляксандр Неўскі.

Чырвоназвёзды совецкі танк—сімвал магутнасці Чырвонай Арміі, сімвал сілы совецкай зброі.

Над выстаўкай узвышаецца манумент вялікага правадыра і палкаводца Іосіфа Вісарыёнавіча Сталіна. Яшчэ здалёк у вочы кідаюцца сталінскія словы, якія высечаны на п'едэстале: «Паклянёмся-ж, таварышы, што мы не пашкадуем сілы для таго, каб умацоўваць нашу Чырвоную Армію, наш Чырвоны Флот».

Паабапал, на вялікіх фанерных лістах і кумачовых палотнішчах, рукою мастака ўвекавечаны эпізоды басў на франтах Айчыннай вайны, напісаны лозунгі, якія заклікаюць да помсты ворагу, заклікаюць на барацьбу за канчатковую перамогу.

А ўнізе, у строгім парадку, рад за радам стаяць узоры трафейнага ўзбраення: самалёты, танкі, бронетранспарцёры, аўтамашыны, гарматы, мінамёты, кулямёты... Зброя ката Гітлера, пры дапамозе якой ён знішчаў гарады і вёскі, помнікі старыны і мастацтва, музеі і школы, якой ён знішчаў нявінных людзей Беларусі, Чэхаславакіі, Польшчы, Украіны, Бельгіі, Літвы, Галандыі, Францыі, Югаславіі, Грэцыі, Нарвегіі. Гэтай зброяй нямецкія людаеды намерваліся заваяваць увесь свет, намерваліся паставіць на калені ўсё прагрэсіўнае чалавецтва.

Але знайшлася сіла, якая перамагла нямецкую зброю. Знайшлася зброя больш магутная і грозная. Гэтая сіла—Чырвоная Армія, совецкі народ, гэтая зброя—совецкая зброя. Вынікі відавочны.

У сярэднім раду стаіць нямецкі знішчальнік «Мессершмідт-109-ф». Яшчэ год таму назад немцы на ўвесь свет крычалі, што няма хутчэйшага самалёта, што «Мессершмідт» — кароль паветра. Але хутка немцы вымушаны былі сціхнуць. Іх «каралі» паветра сотнямі сталі гінуць на совецка-германскім фронце. Іх збівалі больш быстраходныя совецкія знішчальнікі.

Побач стаіць другі нямецкі знішчальнік «Фокке-Вульф-190». А колькі гэтых самалётаў збіта над нашай зямлёй!

Наведвальнікі выстаўкі ўважліва аглядаюць нямецкія самалёты. Амаль у кожнага з іх свае ўспаміны аб гэтых драпежніках. Вось пажылая жанчына, работніца Мінскага скурзавода Анастасія Бажко. Яна спынілася супроць нямецкага самалёта і з гораччу гаворыць:

— Вось які ён, сцервятнік, што з кулямёта абстрэльваў нашу вуліцу Сямёра дзяцей забіў...

Другая група наведвальнікаў—байцы, афіцэры, жанчыны і старыя—спынілася каля 210 мм нямецкай мартыры.

— З такіх гармат,—расказвае радавы Герасіменка,—немцы абстрэльвалі Ленінград. Снарады пападалі ў школы, у дзіцячыя дамы, больніцы. Гітлер спадзяваўся напалохаць совецкіх людзей такімі гарматамі, пахіснуць іх волю да супраціўлення. Але нічога не выйшла! Прышлося гітлераўцам драпаць, кідаючы свае гарматы. У Чырвонай Арміі гарматы аказаліся мацнейшымі.

Каля шасцістволных мінамётаў, якія выстаўлены на выстаўцы, сабралася група байцоў. Малодшы лейтэнант Багамолаў расказвае:

— Нашы франтавікі прадавалі гэты мінамёт «ішаком». Мы паспяхова змагаемся з ім. Мінамёт вызначаецца дрэнпай меткасцю, цяжкі, нязграбны. Адным словам, гэтае новае «сакрэтнае» ўзбраенне гітлераўцаў не спалохала совецкіх воінаў...

Увагу многіх наведвальнікаў выстаўкі прыкоўвае велізарны нямецкі танк тыпу «Т-VI», які падбіт на шасе Масква—Мінск. Два чырвонаармейцы—Барзенка і Сямбераў ажыўлена гутараць:

— Вось бачыш, — гаворыць Барзенка,—якая грамадзіна. Адна толькі лабавая броня сто міліметраў. І ўсё-ж, паглядзі, колькі на ім прабоін. Толькі на лабавой броні 28, а на бартах, на башні... Усяго і не пералічыш.

Гутарка байцоў прыцягвае да сябе і іншых наведвальнікаў выстаўкі. Адзін з іх, пажылы мужчына, выказвае сваю думку:

— Вось табе і «тыгр»! Ён такі вялікі, а нашы перамаглі яго. Бачыце, танк нібы рэшата ад совецкіх спарадаў...

Пасля агляду нямецкіх «тыграў» і «пантэраў» наведвальнікі спыняюцца перад грозным совецкім танкам, які горда ўзвышаецца на высокім пастаменце. Да групы байцоў падыходзіць гвардзеец Жэлудзікаў. Ён вымае з футляра баян і расцягвае яго галасістыя мяхі. Яго пальцы хутка прабягаюць па клавішах. Але ўвагу байцоў прыкоўвае не сам баяніст і нават не яго майстэрская ігра, а сам баян. Ён старэнькі, з заклееным мехам. На пачарнеўшай пласцінцы яшчэ можна разабраць надпіс: «Адважным совецкім танкістам ад рабочых танкабудаўнікоў Урала».

— Відаць, на многіх франтах пабываў,—заўважае адзін з байцоў.—Цікава ведаць, гэта ваш баян?

Гвардыі радавы Жэлудзікаў адказаў не адразу. Ён дастаў кісет, скруціў папяроску і, прыкурыўшы, расказаў:

— На жаль, я і сам не ведаю ўсёй гісторыі баяна. А вось як ён папаў да мяне, я раскажу. Гісторыя яго звязана вось з гэтым танкам, што стаіць на пастаменце...

Наш гвардзейскі полк гнаў немцаў з беларускай зямлі. Па лясах, дарогах магутнай лавінай рухаліся нашы танкі, у паветры стаямі кружыліся нашы самалёты. Горача было немцам, вельмі горача. Пад Мінскам яны папалі ў кацёл. Яшчэ гарачэй ім стала. Усё-ж яны заядла агрызаліся.

На ўзлессі мы наткнуліся на сляды бяспрыкладнай схваткі совецкага танка з нямецкімі «тыграмі». Уявіце сабе такі малюнак: адзін нямецкі «тыгр» з разбітай спарадам башняй замёр у варонцы ад спарада, другі—зваліўся на бок, а трэці—стаіць абгарэлы. У яго ўрэзаўся наш танк, на барту якога быў надпіс крэйдай «За родную Беларусь». Наш танк параніў нямецкага «тыгра». Побач з танкамі валяліся 8 варожых трупаў, а паміж імі ляжаў наш танкіст з пісталетам у руцэ. Невядомы герой...

Хто ён?—Мы ніяк не маглі даведацца. Уся вопратка танкіста згарэла. Калі мы палезлі ў яго танк, то там знайшлі вось гэты баян, памяты, прабіты двума асколкамі.

Мы пахавалі невядомага героя з высокай воінскай чэсцю. Над яго магілай мы паклялiся жорстка адпомсціць ворагу за яго смерць. Баян я ўзяў з сабою. Адрамантаваў і вось іграю...

Вось які совецкі танк стаіць на выстаўцы ўзораў трафейнага ўзбраення! Гэта танк невядомага героя, якім ён сакрушыў тры нямецкія «тыгры». Герой загінуў, але яго подвіг, які праславіў магутнасць совецкай зброі, бяссмертны. Танк героя, як сімвал непераможнасці і магутнасці, красуецца на выстаўцы.

Выстаўка пакуль што складаецца з некалькіх аддзелаў — артылерыйскага, танкавага, авіяцыйнага і інжынернага. Яны яшчэ няпоўныя. Але ўжо цяпер тут прадстаўлены галоўныя віды нямецкага ўзбраення. Усё гэта звезена з палёў нядаўніх бітваў пад Бабруйскам, Мінскам, з лясоў і палёў Беларусі.

Выстаўку наведалі некалькі дзесяткаў тысяч чалавек. Шмат карыснага і павучальнага атрымалі яны тут. Яны ўнеслі з сабой веру ў магутнасць нашай совецкай зброі, у сілу нашай Чырвонай Арміі. Кожны ўпэўнен, што няма такой сілы ў свеце, якая магла-б устаяць супроць гераічнай Чырвонай Арміі і магутнасці совецкай зброі.

С. РОЗУМ.

Комсамольска-маладзёжныя звенні—перадавікі ўздыму зяблева

МАЗЫР, 11 лістапада. (БЕЛТА). Комсамольцы і моладзь калгасаў обласці, уключыўшыся ў спаборніцтва на хутчэйшы ўздым зяблева, паказваюць высокія ўзоры работы. Комсамольска-маладзёжнае звяно Арыны Нерад з калгаса «Чырвоная зорка», Лельчыцкага раёна, з-за недахопу цяглавай сілы, навучыла хадзіць у ярмс кароў, на якіх штодзённа ўзорваюць па 0,35 гектара зяблева.

Узоры добрай работы на ўздыме зяблева паказваюць і другія комсамольска-маладзёжныя звенні. Толькі па Брагінскаму раёну працуе 28 такіх звенняў, якія падняслі ўжо 440 гектараў. Усяго па обласці комсамольцы і моладзь падняслі больш 4.200 гектараў зяблева.

ПОЛАЦКАЯ ЭЛЕКТРАСТАНЦЫЯ ДАЛА ПЕРШЫ ТОК

ПОЛАЦК, 13 лістапада. (БЕЛТА). Гарадская электрастанцыя дала першы ток прадпрыемствам і ўстановам. Будаўнікі станцыі ў кароткі тэрмін аднавілі асноўныя цэхі і змантыравалі турбагенератар.

Зараз вядуцца паскораныя работы па ўзмацненню магутнасці электрастанцыі з тым, каб у бліжэйшы час даць ток і жыллёвыя дамы.

ПАЛЕСКІ АБЛАСНЫ ДРАМАТЫЧНЫ ТЭАТР АДКРЫЎ СЕЗОН

МАЗЫР, 11 лістапада. (БЕЛТА). Палескі тэатр першым у рэспубліцы адкрыў зімовы тэатральны сезон. Адбылася прэм'ера спектакля «Заложнікі», беларускага драматурга А. Кучара. П'еса расказвае аб гераічнай барацьбе партызан і іх слаўным кіраўніку—бацьку Мінаі. Спектакль пастаўлен рэжысёрам Сурыкавым.

ЗАДАЧЫ ХАРЧОВАЙ ПРАМЫСЛОВАСЦІ БЕЛАРУСІ

У дарэволюцыйнай Беларусі, як у аграрнай краіне, перш за ўсё парадзілася прамысловасць па пераапрацоўцы сельскагаспадарчых прадуктаў. Але яна была мізэрнай, зусім нязначнай. На тэрыторыі Усходняй Беларусі ў 1913 годзе было 508 дробных харчовых прадпрыемстваў, на кожным з якіх працавала па 12—13 чалавек. Аналагічную карціну прадстаўляў і цэнзавы прамысел. У 1913 годзе на 420 цэнзавых прадпрыемствах было занята 5.441 рабочы.

Значнае месца ў харчовым балансе насельніцтва Беларусі займалі збор і пераапрацоўка грыбоў, дзікарастучых ягад і розных гародных культур. Усе гэтыя віды вытворчасці вяліся выключна саматужным спосабам. Перапрацоўка плодаў зусім не праводзілася і сабраныя плады вывозіліся за межы Беларусі.

За гады сталінскіх пяцігодак раслі гарады, ствараліся новыя прамысловыя цэнтры, мацнела социялістычная сельская гаспадарка, узрастала заработная плата працоўных. Усё гэта выклікала стварэнне буйнай харчовай індустрыі ў Беларусі.

У 1940 годзе харчовая прамысловасць выпусціла на поўмільярда руолёў прадукцыі. На харчовых прадпрыемствах было занята 20.400 рабочых.

Даволі рознастайным быў і асартымент вырабаў харчовай прамысловасці. Хлебнікі выпускалі звыш 70 гатункаў хлеба-булачных вырабаў, кандзіцеры давалі 155 рознастайных відаў сваёй прадукцыі. Таксама і іншыя галіны харчовай прамысловасці давалі спажыўцу розныя гатункі сваіх вырабаў, аб якіх ведаюць у многіх кутках Совецкага Саюза. Беларускія дрожджы не мелі сабе роўных па якасці, крахмал беларускіх крахмальных заводаў меў попыт на замежных рынках. Канфеты фабрыкі «Комунарка» можна было сустрэць і ў аддаленых гарадах Сібіры і ў вёсках Башкірыі.

Бурны росквіт харчовай прамысловасці Беларусі быў часова спынен подлым нападам фашысцкіх захопнікаў на Совецкі Саюз. За годы акупацыі і гаспадарання ворага харчовая прамысловасць Беларусі была моцна разбурана і раскрадзена захопнікамі.

Калі ў 1941 годзе толькі па Наркамхарчпрому было звыш 400 харчовых прадпрыемстваў, то пасля гаспадарання нямецкіх акупантаў не асталося ні аднаго не пацярпеўшага прадпрыемства, а большасць з іх зусім разбурана, або спалена. Пры гэтым найбольшаму разбурэнню падвергліся самыя буйныя прадпрыемствы сталінскіх пяцігодак: фабрыка «Комунарка», камбінат «Спартак», «Х Кастрычнік», віцебская табачная фабрыка, віцебскі маслабойны завод і іншыя. З 10 буйных кандзіцерскіх фабрык, якія выпускалі звыш 40 тысяч тон вырабаў на 72 мільёны рублёў, асталася толькі адна невялікая фабрыка. З 35 крахмальных заводаў уцалелі толькі два, але і гэтыя прадпрыемствы патрабавалі капітальнага рамонту. З чатырох дрожджавых заводаў астаўся адзін. Харчовай прамысловасці Беларусі немцы нанеслі страт на 648 мільёнаў рублёў.

Пасля выгнання фашысцкіх мярзотнікаў харчавікі дружна прыняліся за аднаўленне прамысловасці. Ужо з першых дзён паўсюды аднавілі работу хлебнікі, сям-там і саматужным спосабам. Праз некалькі месяцаў пасля вызвалення Гомеля пачаў даваць кандзіцерскія вырабы камбінат «Спартак». Па некалькі мільёнаў рублёў было перадана гандлюючым арганізацыям розных пладова-ягадных він і вырабаў, а пасля вызвалення ўсёй Беларусі паявілася піва, дрожджы, махорка, віна-водачныя вырабы.

Але праробленая работа — толькі пачатак. У самы кароткі тэрмін павінны быць адноўлены ўсе разбураныя прадпрыемствы харчовай прамысловасці. Адначасова з гэтым яны павінны ўжо і зараз даваць максімум харчовай прадукцыі самага рознастайнага асартыменту Чырвонай Арміі і тылу; стварыць новыя сыравінныя базы і смела ўнядраць у вытворчасць новыя віды харчовай сыравіны; адрадзіць і расшырыць новыя галіны і віды харчовай прамысловасці (вытворчасць цукру, канцэнтратаў, вітамінаў і інш.); наблізіць вытворчасць да месц спажывання і крыніц сыравіны; на базе мясцовай сыравіны асвоіць і ўнядрыць у масавую вытворчасць лепшыя нацыянальныя гатункі хлеба, піва, віна і інш. Харчавікі прыступілі ўжо да распрацоўкі рэцэптуры і асваення налівак і він пад назвай «Крыжачок», піва «Беларускае», журавінных і іншых напіткаў з дзікарастучых ягад і гародных культур.

Шырокая вытворчасць натуральных сіропаў, сокаў, эсенцый і вутлекісланы створыць спрыяючыя ўмовы для паўсямеснай выпрацоўкі напіткаў і вод у самых аддаленых населеных пунктах.

У 30 гарадах Беларусі адноўлена работа хлебакамбінатаў. У гэтым-жа годзе павінны быць уведзены ў дзеянне гомельскі хлебазавод, новабеліцкі, лідскі, мазырскі, крычаўскі і клімавіцкі хлебакамбінаты і адноўлена першая чарга віцебскага завода.

Далейшы рост хлебапякарнай прамысловасці будзе ісці з улікам будучага бурнага росту насельніцтва ў аднаўляемых гарадах Беларусі і ў першую чаргу ў сталіцы БССР—гор. Мінску.

У бліжэйшы-ж час асартымент хлеба-булачных вырабаў павінен стаць самым рознастайным, у адпаведнасці з запатрабаваннямі і густам спажыўца. Шырока вядомы ў Совецкім Саюзе гатунак хлеба «мінскі» неабходна паўсюды ўвесці ў вытворчасць.

Фашысцкія захопнікі поўнасцю знішчылі піваварныя заводы ў многіх гарадах рэспублікі. Перавозка піва і напіткаў на далёкія адлегласці звязана са значнымі цяжкасцямі і пагаршэннем якасці прадукцыі. Усё гэта яшчэ перад вайной высунула неабходнасць рэканструкцыі і расшырэння піваварэння. Было намечана будаўніцтва невялікіх піваварных заводаў у гарадах Гомелі, Бабруйску, Слуцку, Полацку і іншых. Зараз гэтая неабходнасць яшчэ больш узрастае. Таму побач з аднаўленнем разбураных піваварных заводаў ужо ў бліжэйшыя годы неабходна прыступіць да будаўніцтва новых заводаў, набліжаючы іх да месц спажывання. Растучы добрабыт працоўных выклікаў павышаныя патрабаванні да якасці піва, напіткаў і іх асартымента. З першымі крокамі па аднаўленню піваварных заводаў неабходна ўвесці і замацаваць найбольш любімыя спажыўцом гатункі і ў 1945 годзе распрацаваць рэцэптуру і асвоіць новы гатунак піва «Беларускае» з тым, каб яно стала вядомым за межамі рэспублікі.

Для расшырэння піваварэння і паляпшэння яго якасці неабходна аднавіць і расшырыць хмелеводства ў БССР як у калгасах, так і шляхам арганізацыі 1—2 хмелеводчых калгасаў, а таксама замацаваць у пэўных раёнах і калгасах пасевы стандартнага піваваранага гатунку ячменю «Вяцкі двухрадны».

У 1945 годзе намячаецца прыступіць да арганізацыі і выпуску шырокага асартымента натуральных сокаў і напіткаў, скарыстоўваючы для гэтага як дзікарастучую сыравіну, так і плады і гародніну.

Народнагаспадарчае значэнне спіртавой прамысловасці за годы сталінскіх пяцігодак рэзка змянілася. Асноўным спажыўцом спірта стала прамысловасць сінтэтычнага каўчука і інш. Попыт на тэхнічны спірт выклікаў рост спіртавой прамысловасці Беларусі. Па вытворчасці спірту на душу насельніцтва наша рэспубліка займала першае месца ў Совецкім Саюзе і ў Еўропе. У 1940 годзе гэтая прамысловасць дала 7.658 дэкалітраў спірту. На тэрыторыі БССР у 1940 годзе дзейнічалі 143 заводы.

Асаблівую ўвагу пры аднаўленні спіртазаводаў трэба звярнуць на іх праектныя магутнасці. Практыка мінулых год паказала, што буйныя заводы слаба былі загружаны бульбянай сыравінай і ім прыходзілася пераапрацоўваць збожжа. Сабекошт-жа збожжавага спірту вышэй у тры разы, чым бульбянога. Апрача таго, дастаўка бульбы на далёкай адлегласці таксама падаражае спірт. З прычыны гэтага трэба праектыраваць магутнасць завода з улікам мінімальнай затраты транспартных сродкаў па дастаўцы бульбы. У бліжэйшыя годы трэба стварыць вакол кожнага спіртзавода сыравінныя базы, трэба ўнядрыць стандартныя тэхнічныя гатункі бульбы, а таксама прадоўжыць навукова-даследчую работу па вывядзенню новых тэхнічных гатункаў.

Крахмальна-патачная прамысловасць БССР мае вялікую будучыню. Неабходна ў бліжэйшы час аднавіць існуючыя заводы, павялічыць вытворчасць крахмала-прадуктаў і расшырыць асартымент выпускаемай прадукцыі. Трэба наладзіць не толькі выпуск лепшых гатункаў крахмалу, патакі, сухога кісялю, але і такіх новых прадуктаў, як глюкоза, штучны мёд, саго (крупа).

Да вайны кандзіцерская прамысловасць з'яўлялася адной з вядучых галін харчовай прамысловасці, даючы да 40 тысяч тон рознастайных кандзіцерскіх вырабаў у год. Подлы вораг амаль поўнасцю знішчыў усе кандзіцерскія прадпрыемствы. Цяпер кандзіцеры пачынаюць аднаўленне сваёй галіны з саматужнага вырабу, адначасова працуючы па аднаўленню сваіх прадпрыемстваў. Ужо ў 1944 годзе яны павінны даць краіне звыш 500 тон кандзіцерскіх вырабаў. У 1945 годзе і ў наступныя годы кандзіцерская прамысловасць будзе даведзена да магутнасці ў 20.000 тон кандзіцерскіх вырабаў у год. Асаблівая ўвага будзе ўдзелена паляпшэнню якасці і расшырэнню асартымента—выпуску джэмаў, павідла і іншых вырабаў.

Адначасова з аднаўленнем харчовай прамысловасці БССР мы павінны яе расшырыць, рэканструіраваць, падняць на яшчэ больш высокую ступень, на якой яна была да Айчыннай вайны.

І. І. КАРАНДЗЕЙ,
намеснік наркома харчовай прамысловасці БССР.

Водгукі славянскага друку ў ЗША на даклад Старшыні Дзяржаўнага Камітэта Абароны таварыша СТАЛІНА

НЬЮ-ЁРК, 11 лістапада. (ТАСС). Прагрэсіўныя славянскія газеты, якія выходзяць у ЗША, расцэньваюць даклад таварыша Сталіна на ўрачыстым паседжанні Маскоўскага совета як новы крок да ўмацавання саюза Аб'еднаных нацый. Газеты «Слободна реч», якая выдаецца на сербскай мове, «Украінскі шодзені вісці», якая выходзіць на ўкраінскай мове, «Нова доба», якая выдаецца на чэшскай мове, удзяляюць цэлыя старонкі апісанню дасягненняў Совецкага Саюза і яго вызваліцельнай місіі ў вайне.

Газета «Слободна реч» заяўляе, што за кароткі перыяд часу рускі народ стварыў новую перадавую дэмакратычную краіну, якая разбурыла магутнасць фашысцкай Германіі і тым выратавала ўвесь свет ад пагрозы рабства і варварства. Чырвоная Армія прынесла таксама славянскім народам сапраўдную свабоду. Газета рэзка асуджае прафашысцкія групы ў ЗША, якія прабуюць падарваць совецка-амерыканскую дружбу. Яна заклікае дэмакратычныя краіны да больш цеснага супрацоўніцтва з СССР.

Газета «Нова доба» адзначае велізарную ролю Совецкага Саюза ў барацьбе за вызваленне славянскіх народаў ад фашысцкага іга, а таксама эканамічны і палітычны прагрэс СССР.

Як указвае газета «Украінскі шодзені вісці», цяпер увесь свет усведамляе, што Кастрычніцкая рэволюцыя вызваліла рускі народ ад рабства царызма, тым самым паклала пачатак новай эпохі прагрэса, дала народу магчымасць накапіць сілы, якія перамаглі германскую ваенную машыну і выратавалі свет ад фашысцкага панавання. «Мы святкуем не толькі вызваленне Расіі ад захопнікаў, — піша газета, — але таксама развіццё вялікай дружбы і супрацоўніцтва паміж Совецкім Саюзам і дэмакратычнымі краінамі Захада».

Турэцкая газета аб дакладзе таварыша СТАЛІНА

СТАМБУЛ, 9 лістапада. (ТАСС). Садак прысвячае сёння свой перадавы артыкул у газеце «Акшам» дакладу таварыша Сталіна і выбранню Рузвельта. Аўтар указвае, што ён піша аб двух гэтых падзеях разам не толькі таму, што яны саўпалі па часу, але і таму, што яны па сутнасці дапаўняюць адзін другога і аднолькава акажуць вялікі ўплыў на ход вайны.

«Даклад маршала Сталіна,—гаворыцца ў артыкуле, — з'яўляецца самым кампетэнтным выражэннем палітыкі Совецкага Саюза. Таму ён астанецца незабыўным дакументам у гісторыі апошняй фазы вайны. Гэты даклад зроблен у момант, калі Чырвоная Армія, ачысціўшы ўсю совецкую зямлю, прасоўваецца ўперад на ўсіх фронтах. Ён напамінае аб усіх этапах самаадданай і гераічнай бітвы па адлегласці ад Волгі да Дуная. Даклад выклікаў захапленне рускага народа. Апрача таго, што ў дакладзе падкрэслена каштоўная роля супрацоўніцтва ў гэтай вайне, ён, бясспрэчна, у такой-жа меры ўмацаваў і пачуццё давер'я, аснаванае на баявой дружбе саюзнікаў. Той факт, што Сталін у момант, калі совецкія войскі атрымліваюць па ўсіх фронтах перамогі, удзяліў столькі ўвагі супрацоўніцтву і паўяму такую ацэнку, будзе крыніцай сілы для саюзнікаў. Падкрэсліўшы самым ясным і пераканаўчым чынам адзінадушша саюзнікаў у перыяд завяршэння вайны і стварэння міру, маршал Сталін рассеяў сумненні аб паяўнасці ўсякага роду рознагалоссяў. З даклада Сталіна вырысоўваецца яснае аблічча Совецкай Расіі, якая разам з саюзнікамі рашыла давесці вайну да канца, якая паважае свабоду і незалежнасць другіх народаў, рыхтуецца да стварэння працяглага міру і прадухілення агрэсіі і якая не жадае аслабляць пагаднення з саюзнікамі, не гледзячы на тое, што прызнае існаванне паміж імі розніц у поглядах».

Аўтар указвае далей, што нямецкае супраціўленне ў апошні час жывілася надзеямі на раскол у лагеры саюзнікаў, на правал Рузвельта і змяненне ў палітыцы Амерыкі. Выступленне Сталіна, заўважае Садак, канчаткова знішчыла першую надзею, а пераабранне Рузвельта — другую. «Выходзячы з гэтага, можна сказаць, што лістапад прынёс з сабой катастрофу нямецкаму маральнаму фронту. Дзве надзеі, якія мелі месца на працягу двух дзён, зрабілі відавочнай бескарыснасць нямецкага супраціўлення, і ўплыў гэтых двух падзей будзе больш значным, чым уплыў аперацый на фронтах».

ШВЕДСКІ ПРАТЭСТ ГЕРМАНІІ

СТАКГОЛЬМ, 11 лістапада. (ТАСС). Германія паведаміла шведскаму ўраду аб тым, што ўсё Балтыйскае мора аб'яўляецца зонай ваенных дзеянняў. Немцы патрабуюць спынення ўсялякага суднаходства, у тым ліку і рыбалоўнага, за межамі тэрытарыяльных шведскіх вод.

ЛОНДАН, 12 лістапада. (ТАСС). Агенцтва Рэйтэр перадае з Стакгольма: «Сёння Швецыя абвергла заяву Германіі аб тым, што Балтыйскае мора з'яўляецца зонай ваенных дзеянняў і што ўсе судны, сустрэтыя ў гэтай зоне, падвяргаюцца рыску неадкладнага абстрэлу. У афіцыяльнай шведскай ноце, уручанай германскаму пасольству ў Стакгольме, гаворыцца, што шведскі ўрад лічыць германскі ўрад «цалкам адказным за вынікі якіх-небудзь нападаў на шведскія судны».

ВЕНГЕРСКІ ЗАЛАТЫ ЗАПАС ВЫВЕЗЕН У ГЕРМАНІЮ

ПАРЫЖ, 13 лістапада. (ТАСС). Як перадае парыжскае радыё, па атрыманых вестках, венгерскі залаты запас вывезен у Германію. У Германію вывозіцца таксама абсталяванне буйнейшых прамысловых прадпрыемстваў Венгрыі.

АРЫШТ ЗА ШПІЯНАЖ ДЫРЭКТАРА НЯМЕЦКАГА «БЮРО ТУРЫЗМА» У СТАКГОЛЬМЕ

СТАКГОЛЬМ, 13 лістапада. (ТАСС). Як паведамляе газета «Афтонбладэт», дырэктар нямецкага «Бюро турызма» ў Стакгольме барон Госслер затрыман стакгольмскай паліцыяй па абвінавачанню ў шпіянажы.

Ва Усходняй Прусіі. Совецкая цяжкая артылерыя праходзіць па вуліцах нямецкага горада Шырвіндт. Фото Ф. Кіслова (Фотахроніка ТАСС).

Святкаванне ў Любліне дня незалежнасці Польшчы

ЛЮБЛІН. (ТАСС). З вялікім уздымам быў адсвяткаван Дзень незалежнасці Польшчы.

Газета «Рэч Паспаліта» апублікавала на першай старонцы прывітанні таварышоў М. І. Калініна, І. В. Сталіна і В. М. Молатава з выпадку нацыянальнага свята Польшчы. У перадавым артыкуле адзначаецца, што совецкі ўрад з першых дзён зараджэння польскай дзяржавы падтрымліваў незалежнасць польскага народа.

На цэнтральнай плошчы горада адбыліся парад люблінскіх часцей Войска Польскага і дэманстрацыя насельніцтва, у якой прыняла ўдзел 10.000 чалавек.

На трыбуне знаходзіліся Берут, Осубка-Мараўскі, генерал Роля-Жымерскі і другія члены Краёвай Рады Нарадовай і Польскага Камітэта Нацыянальнага Вызвалення. Насельніцтва, якое сабралася на плошчы і прылягаючых вуліцах, вітала польскія войскі. Раздаваліся вітанні ў чэсць Войска Польскага, Чырвонай Арміі, у чэсць Маршала Сталіна.

Вечарам у гарадскім тэатры адбылося ўрачыстае паседжанне. У прэзідыум былі выбраны члены Краёвай Рады Нарадовай, Польскага Камітэта Нацыянальнага Вызвалення і генералы Войска Польскага. На паседжанні былі агалошаны вітанні таварышоў Сталіна, Молатава, Калініна. Пасля гэтага старшыня Краёвай Рады Нарадовай Б. Берут выступіў з палітычным дакладам, у якім абрысаваў палітыку былых рэакцыйных урадаў Польшчы. Ён падкрэсліў ролю совецкага ўрада ва ўтварэнні Польскай дзяржавы ў 1918 годзе і вызваленчую ролю Чырвонай Арміі ў Польшчы ў цяперашні час. Ад імені Войска Польскага выступіў з прамовай генерал Берлінг.

Паседжанне прайшло з вялікім уздымам. Калі Берут і Берлінг у сваіх прамовах упаміналі Совецкі Саюз, Чырвоную Армію і таварыша Сталіна, раздаваліся бурныя апладысменты.

Пасля паседжання адбыўся канцэрт з удзелам польскіх і маскоўскіх артыстаў.

Выступленне маршала Тіто на паседжанні актыфашысцкага Веча Народнага Вызвалення Сербіі

БЕЛГРАД, 11 лістапада. (ТАСС). Як перадае радыёстанцыя «Слободна Югаславія», 9 лістапада ў Белградзе адбылося ўрачыстае паседжанне Антыфашысцкага Веча Народнага Вызвалення Сербіі, на якім выступіў маршал Югаславіі Тіто. У сваёй прамове ён сказаў:

«Я рад, што сёння, пасля трох з палавінай год цяжкіх пакут народа Сербіі, я магу тут, у Белградзе, вітаць вас, як сапраўдных прадстаўнікоў дэмакратычнай Сербіі. Вы самі ведаеце, што тут, у Сербіі, мы пачалі барацьбу, тут арганізавалі паўстанне супроць ворага не толькі паўднёвых славян, але і ворага ўсіх славян і ўсяго чалавецтва — супроць нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Тры годы таму назад праслаўленыя сыны Шумадзіі, сыны ўсёй Сербіі з голымі рукамі ўступілі ў смяртэльную барацьбу не толькі за чэсць нацыі, за чэсць Сербіі, але і за сваё існаванне. Вы ведаеце, якія гэта былі цяжкія часы. Але, не гледзячы на гэта, мы ўсе з самага пачатку нашай нароўнай барацьбы глыбока верылі, што калі-небудзь гэтая барацьба прынясе свае плады, што перамога будзе на нашым баку. Што намі кіравала і што ўсяляла ў нас веру ў перамогу? Кіравала намі любоў да сваёй Айчыны, любоў да незалежнасці нашага народа, кіравала намі вера ў неперамажнасць вялікага нашага саюзніка — Совецкага Саюза; кіравала намі вера ў неперамажнасць слаўнай Чырвонай Арміі; кіравала намі вера ў вялікі саюз СССР, Англіі і Амерыкі, які быў створан пазней, — саюз самых буйных дзяржаў свету, якія паставілі ўсе свае сілы на службу чалавецтву».

«У нашай звышчалавечай барацьбе, — прадаўжаў Тіто, — Сербія прынесла велізарныя крывавыя афіры. Не толькі ў сябе ў Сербіі, але і на другіх ваенных тэатрах Югаславіі яе сыны аддавалі сваю кроў і сваё жыццё за вялікую справу свабоды сваёй радзімы — Сербіі і ўсёй новай федэратыўнай Югаславіі.

Але вялікія афіры прынесены не дарэмна. Сыны ўсіх народаў Югаславіі ўзняліся і вызвалілі разам з брацкай гераічнай Чырвонай Арміяй наш любімы горад Белград—сталіцу ўсіх народаў Югаславіі.

У гарніле нашай вялікай звышчалавечай барацьбы не толькі выгартаваны брацтва і адзінства народаў Югаславіі, але і створана новая, сапраўды народная ўлада. Перад вамі, прадстаўнікамі гераічнай Сербіі, зараз стаіць задача: прадаўжаць справу, якую пачалі вашы слаўныя сыны—байцы партызанскіх атрадаў і Народна-вызваленчай арміі.

Няхай жыве шчаслівая, свабодная Сербія ў аб'еднанай федэратыўнай дэмакратычнай Югаславіі!»

Адкрыццё мемарыяльнай дошкі на доме Горкага ў Сарэнто

РЫМ. (ТАСС). 10 лістапада ў Сарэнто адбывалася ўрачыстая цэрэмонія ўстанаўлення мемарыяльнай дошкі на доме, у якім жыў Максім Горкі. Урачыстасць адбывалася ў прысутнасці надзвычайнага і паўнамоцнага пасла СССР у Італіі тав. Кастылёва, членаў совецкай профсаюзнай дэлегацыі — таварышоў Тарасава, Аксёнава, Шчупляцова і Шэўлягіна. Міністр народнай асветы дэ Руджэро і міністр шляхоў зносін Чэрабуона, якія спецыяльна прыбылі з Рыма, прадстаўлялі на ўрачыстасці італьянскі ўрад. Прысутнічалі таксама прадстаўнікі мясцовых італьянскіх і саюзных улад, профсаюзных арганізацый і арганізацый палітычных партый у Неапалітанскім раёне.

Мэр Сарэнто дэ Анжэліс адкрыў мітынг, у якім прынялі ўдзел 500 чалавек. Ен сардэчна вітаў совецкіх гасцей і ўшанаваў памяць Максіма Горкага. Міністр дэ Руджэро ў сваёй прамове гаварыў аб дзейнасці і творчасці Горкага.

З кароткімі прамовамі, прысвечанымі п[...] мяці Горкага, і з вітаннямі совецкаму н[...] роду выступілі прадстаўнікі рабочых Торр[...] Аннунцыата (прамысловы цэнтр на поўд[...] розе паміж Неапалем і Сарэнто) і мясцов[...] арганізацый комуністычнай і соцыялісты[...] най партый.

Тав. Кастылёў падзякаваў прадстаў[...] коў улад і сабраўшыхся за дружаствен[...] прыём і падкрэсліў у сваёй прамове неац[...] німую ролю творчасці Горкага ў грама[...] скім і культурным развіцці народаў С[...] вецкага Саюза і ў мабілізацыі яго сіл [...] часе вайны.

Тав. Тарасаў у сваёй прамове адзначы[...] уплыў Горкага на духоўнае выхаванне с[...] вецкіх людзей і на іх гераічныя намаган[...] ў Вялікай Айчыннай вайне супроць фаш[...] сцкага варварства.

Пасля прамоў было знята пакрывала [...] мемарыяльнай дошкі.

ВАЕННЫЯ ДЗЕЯННІ Ў ЗАХОДНЯЙ ЕЎРОПЕ

ЛОНДАН, 14 лістапада. (ТАСС). У паведамленні штаба вярхоўнага камандавання экспедыцыйных сіл саюзнікаў гаворыцца:

Войскі саюзнікаў 13 лістапада прадаўжалі прасоўвацца на поўнач і поўдзень ад Меца. Пяхотныя часці дасягнулі Эрні і знаходзяцца на адлегласці мілі на паўночны ўсход ад Ансервіля. У руках саюзнікаў знаходзяцца наступныя гарады: Корні на рацэ Мозель, Поммер'е, Верне і Льеон, на паўднёвы ўсход ад Корні.

У сектары на ўсход ад Люневіля, не гледзячы на моцнае супраціўленне ворага, адзначана прасоўванне прыкладна на 2 мілі. Горад Леінтрэ вызвален. Адзначан істотны поспех у сектары на паўднёвым усходзе ад Бруйерэ.

Аперацыі ў Галандыі абмежаваліся дзеяннямі патрулёў і артылерыйскай перастрэлкай.

Дрэннае надвор'е зноў абмежавала дзея[...] ні авіяцыі.

ЛОНДАН, 14 лістапада. (ТАСС). У п[...] ведамленні штаба ўзброеных сіл саюзніка[...] на міжземнаморскім тэатры ваенных дзея[...] няў гаворыцца, што ў Італіі часці 8-й ар[...] значна прасунуліся ў раёне горада Фор[...] На паўднёвым захадзе ад Форлі англі[...] скія войскі фарсіравалі ў некалькіх месц[...] раку Монтоне і, не гледзячы на моцнае с[...] праціўленне праціўніка, прасоўваюцца [...] прадгор'ях на поўнач ад ракі. На левы[...] флангу часці 8-й арміі занялі Баньоло [...] пераадольваючы супраціўленне праціўнік[...] ачысцілі ад ворага важнае ўзвышша Мон[...] Казола. На астатніх участках фронта ме[...] месца сутычкі патрулёў.

Авіяцыя саюзнікаў зрабіла рад налёт[...] на варожыя ваенныя аб'екты ў Італіі [...] Югаславіі.

ПАТАПЛЕННЕ ГЕРМАНСКАГА ЛІНКОРА

ЛОНДАН, 14 лістапада. (ТАСС). Міністэрства авіяцыі паведаміла аб патапленні германскага лінкора «Тарпі». 29 англійскіх самалётаў «Ланкасцёр» скінулі на лінкор бомбы вагой у 5 тон. Пасля некал[...] кіх прамых попаданняў лінкор перавярнуў[...] і затануў.

Баі ў Югаславіі

БЕЛГРАД, 14 лістапада. (ТАСС). Вярхоўны штаб Народна-вызваленчай арміі Югаславіі паведамляе, што ў Македоніі югаслаўскія часці прарвалі знешнюю абарону Скопле, уварваліся ў горад і вядуць вулічныя баі. Часцямі Народна-вызваленчай арміі занята правабярэжная частка горада і чыгуначная станцыя ў паўночнай частцы Скопле.

У Метахіі, у сектары Белага Дрына, югаслаўскія часці пасля жорсткіх баёў вызвалілі Джаковіцу. Варожы гарнізон г[...] рада поўнасцю знішчан.

У Чорнагорыі югаслаўскімі часцямі зая[...] горад Цэцінье, у выніку чаго адрэзан [...] шляхі адступлення сканцэнтраваным у ра[...] не Падгорыцы нямецкім часцям. Нямец[...] гарнізон у Цэцінье знішчан, захоплены б[...] гатыя ваенныя трафеі.

У Далмацыі, у сектары Кніна прада[...] жаюцца аперацыі па знішчэнню акружаны[...] нямецкіх часцей.

КАМЮНІКЕ АБ ПРАБЫВАННІ ЧЭРЧЫЛЯ І ІДЭНА Ў ФРАНЦЫІ

ЛОНДАН, 14 лістапада. (ТАСС). Як перадае агенцтва Рэйтэр, у Парыжы апублікавана камюніке аб гутарках паміж Чэрчылем, Ідэнам і Дэ-Голем. У камюніке пасля пералічэння цэрамоній, якія адбыліся ў чэсць англійскіх гасцей, гаворыцца:

«Візіт брытанскіх міністраў даў магчымасць генералу Дэ-Голю і міністру замежных спраў абмеркаваць з імі ўсе пытанні, якія датычаць вядзення вайны і падрыхтоўкі да міру. Гэтыя гутаркі былі, у прыватнасці, прысвечаны непасрэдным праблемам, узнікшым цяпер, калі Францыя вызвалена, каб яна магла як мага паўней удзельнічаць у агульнай барацьбе. Пр[...] абмеркаванні ўсіх палітычных пытання [...] французскія і брытанскія міністры былі а[...] полькава шчаслівы адзначыць поўна[...] адзінства поглядаў, адпавядаючае салідар[...] насці іх інтарэсаў, і цеплыню пачуцця[...] што знайшлі сваё выражэнне ў прамова[...] якімі абмяняліся французскія і брытанскі[...] міністры».

Адказны рэдактар В. САМУЦІН.

СЁННЯ У КІНОТЭАТРАХ:

КІНОТЭАТР «ПЕРШЫ» — «З О Я»

КІНОТЭАТР «РАДЗІМА» «ДЖОРДЖ З ДЗІНКІ ДЖАЗА»

БЕЛАРУСКІ Дзяржаўны Музей гісторыі вялікай Айчыннай вайны

праводзіць прыём калектыўных заявак на экскурсіі па выстаўках:

УЗБРАЕННЕ БЕЛАРУСКІХ ПАРТЫЗАН І БОЛЬШЭВІЦКІ ДРУК БЕЛАРУСІ У ДНІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ.

ПРЫЕМ КАЛЕКТЫЎНЫХ ЗАЯВАК НА ЭКСКУРСІІ ПРАВОДЗІЦЦА ШТОДЗЕННА З 12 ДА 16 ГАДЗІН.

АДРАС: гор. Мінск, Плошча Свабоды, Музей, 3-ці паверх, лекцыйна-экскурсійнае бюро.

ДЫРЭКЦЫЯ.

БЕЛАРУСКІ ІНСТЫТУТ НАРОДНАЙ ГАСПАДАРКІ імені В. В. КУЙБЫШАВА

АБ'ЯЎЛЯЕ прыём студэнтаў

на 1944—45 навучальны год на 1, 2, 3, 4 курсы.

НА ФАКУЛЬТЭТЫ: ПРАМЫСЛОВА-ЭКАНАМІЧНЫ, СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧА-ЭКАНАМІЧНЫ, ФІНАНСАВА-ЭКАНАМІЧНЫ, ГАНДЛЕВА-ЭКАНАМІЧНЫ І ЭКАНОМІКА-СТАТЫСТЫЧНЫ.

У інстытут прымаюцца асобы абодвух полаў ва ўзросце ад 17 да 35 год, з сярэдняй адукацыяй і паспяхова вытрымаўшыя прыёмныя іспыты.

Іспыты—па матэматыцы, геаграфіі, гісторыі народаў СССР, рускай мове і літаратуры.

Скончыўшыя школу з атэстатам выдатніка прымаюцца без іспытаў.

На 2, 3 і 4 курсы прымаюцца асобы, якія раней навучаліся ў эканамічных ВНУ.

ЗАЯВЫ АБ ЗАЛІЧЭННІ У ІНСТЫТУТ ПАДАЮЦЦА НА ІМЯ ДЫРЭКТАРА ДА 25 ЛІСТАПАДА.

Да заявы неабходна прыкласці: аўтабіяграфію, атэстат аб сканчэнні сярэдняй навучальнай установы (арыгінал), тры фотакарткі размерам 3 × 4 см. і даведку аб адносінах да воінскага абавязку. Пашпарт прад'яўляецца асабіста.

Асобы, якія паступаюць на 2, 3 і 4 курсы, абавязаны прадставіць дакументы, якія пацвярджаюць іх навучанне ў ВНУ.

ПРЫЕМНЫЯ ІСПЫТЫ З 15 ПА 30 ЛІСТАПАДА.

ПАЧАТАК ЗАНЯТКАЎ 1 СНЕЖНЯ.

Стыпендыя студэнтам устанаўляецца на агульных падставах.

Іншагароднія забяспечваюцца інтэрнатам.

ЗАЯВЫ ПАДАВАЦЬ ПА АДРАСУ: г. Мінск, Дзяржплан пры СНК БССР, дырэктару інстытута.

ДЫРЭКЦЫЯ ІНСТЫТУТА.

Наркамат меліярацыі Беларускай ССР

АБ'ЯЎЛЯЕ ПРЫЁМ

на 6-месячныя курсы памочнікаў-гідратэхнікаў.

На курсы прымаюцца асобы, якія маюць адукацыю не ніжэй 7-мі класаў сярэдняй школы.

Курсанты забяспечваюцца харчаваннем, інтэрнатам і стыпендыяй у размеры 200—300 рублёў у месяц.

Прыём заяў да 20 лістапада.

АДРАС: Мінск, вуліца Максіма Горкага, 50-а.

Выезд на курсы па атрыманню паведам лення аб залічэнні.

ДЫРЭКЦЫЯ.

УПРАЎЛЕННЕ ДЗЯРЖСТРАХА БССР

ДАВОДЗІЦЦА ДА ВЕДАМА ЎСІХ ГРАМАДЗЯН, ШТО ОРГАНАМІ ДЗЯРЖСТРАХА БССР ПРАВОДЗІЦЦА

ДОБРААХВОТНАЕ СТРАХАВАННЕ ХАТНЯЙ МАЁМАСЦІ І ПРАДМЕТАЎ УЖЫТКУ.

НА СТРАХАВАННЕ ПРЫМАЕЦЦА:

ХАТНЯЯ АБСТАНОЎКА, МЭБЛЯ, ЛЮСТРЫ І ІНШ., ВЕЛАСІПЕДЫ, ШВЕЙНЫЯ МАШЫНЫ, МУЗЫКАЛЬНЫЯ ІНСТРУМЕНТЫ АДЗЕННЕ, АБУТАК, ПРАДУКТЫ ХАРЧАВАННЯ, ФУРАЖ І ІНШЫЯ СЕЛЬСКА-ГАСПАДАРЧЫЯ ПРАДУКТЫ.

Органы Дзяржстраха нясуць адказнасць перад страхавальнікам за страты застрахаванай маёмасці ад пажару, маланкі, паводкі, буры, ліўню і іншых стыхійных бедстваў.

Маёмасць можа быць застрахавана на любую суму, але не вышэй кошту па дзяржаўных і кааперацыйных цэнах.

Страхаванне праводзіцца з аглядам маёмасці, аднак, калі маёмасць у добраахвотным парадку страхуецца на суму звыш 15.000 рублёў на сям'ю ў горадзе і 8.000 рублёў на сям'ю ў сельскай мясцовасці, — страхаванне праводзіцца без агляду.

Для адзінокіх грамадзян апошняя сума страхавання хатняй маёмасці без агляду—у гарадах 8.000 рублёў, а ў сельскіх мясцовасцях 5.000 рублёў

ДОБРААХВОТНАЕ СТРАХАВАННЕ ХАТНЯЙ МАЁМАСЦІ І ЎЖЫТКУ ГАРАНТЫРУЕ ПРАЦОЎНЫХ АД СТРАТ ІХ АСАБІСТАЙ УЛАСНАСЦІ З ПРЫЧЫНЫ СТЫХІЙНЫХ БЕДСТВАЎ.

За ўсімі даведкамі і тлумачэннямі звяртайцеся ў страхавыя інспекцыі пры райгорфінаддзелах.

ДЗЯРЖСТРАХ БССР.

Дзяржаўная пазыка Другой Пяцігодкі

(выпуск чацвертага года)

БЯСПРОЙГРЫШНЫ ВЫПУСК

ДАВЕДАЧНАЯ ТАБЛІЦА

трыццаць трэцяга тыража выйгрышаў

ТЫРАЖ АДБЫЎСЯ 15 КАСТРЫЧНІКА 1944 года ў гор. МАСКВЕ.

ВЫЙГРЫШЫ ВЫПАЛІ НА НАСТУПНЫЯ НУМАРЫ СЕРЫЯЎ І АБЛІГАЦЫЙ

№№ серый	№№ аблігацый	Размер выйгрыша ў рублях	№№ серый	№№ аблігацый	Размер выйгрыша ў рублях	№№ серый	№№ аблігацый	Размер выйгрыша ў рублях	№№ серый	№№ аблігацый	Размер выйгрыша ў рублях
00114	08*)	500	05360	26*)	500	09836	17*)	500	15646	26*)	500
00184	1—50	150	05400	1—50	150	09854	31*)	500	15677	36*)	500
00254	30*)	500	05496	1—50	150	09891	1—50	150	15680	14*)	500
00322	23*)	500	05553	1—50	150	10061	19*)	500	15889	39*)	500
00358	1—50	200	05601	1—50	150	10369	12*)	500	15925	1—50	150
00408	24*)	500	05610	1—50	150	10661	09*)	500	16065	36*)	500
00414	1—50	150	05621	36*)	500	10711	1—50	200	16070	09*)	500
00573	31*)	500	05830	35*)	500	10854	1—50	200	16075	1—50	150
00601	06*)	500	05917	1—50	150	11034	1—50	150	16230	33*)	500
00665	50*)	500	05955	12*)	500	11062	06*)	500	16425	04*)	500
00675	1—50	150	05991	30*)	500	11145	49*)	500	16473	05*)	3.000
00697	50*)	500	06054	25*)	500	11221	1—50	150	16706	05*)	500
00916	35*)	500	06072	21*)	500	11363	1—50	150	17051	41*)	500
00940	1—50	150	06095	1—50	200	11451	1—50	150	17074	31*)	500
01035	1—50	150	06584	33*)	500	11548	1—50	200	17111	1—50	200
01420	41*)	500	06862	1—50	150	11699	1—50	150	17138	1—50	150
01597	35*)	1.000	06965	09*)	500	11845	48*)	500	17252	28*)	500
01866	11*)	500	07034	50*)	500	11939	33*)	500	17275	42*)	500
01924	1—50	200	07407	17*)	500	12107	48*)	500	17387	28*)	500
02329	30*)	500	07435	1—50	150	12216	1—50	200	17440	27*)	500
02339	1—50	200	07577	11*)	500	12222	1—50	150	18012	01*)	500
02384	06*)	500	07706	1—50	150	12270	27*)	500	18016	1—50	150
02507	08*)	1.000	07860	10*)	500	12372	01*)	500	18034	1—50	150
02509	30*)	500	07960	28*)	500	12431	1—50	200	18158	09*)	500
02514	36*)	500	08005	1—50	200	12561	1—50	200	18340	1—50	200
02723	20*)	500	08098	1—50	150	12584	15*)	500	18356	01*)	500
03122	1—50	200	08295	24*)	500	12733	1—50	200	18359	31*)	500
03191	11*)	500	08320	1—50	150	12764	05*)	500	18398	1—50	200
03401	1—50	150	08362	30*)	500	13115	1—50	150	18409	28*)	500
03471	01*)	500	08581	1—50	150	13152	1—50	200	18453	1—50	200
04084	1—50	200	09020	1—50	150	13257	16*)	500	18496	24*)	500
04162	29*	500	09104	32*)	500	13514	1—50	150	18553	20*)	500
04265	05*)	500	09123	1—50	200	13752	1—50	200	18561	1—50	150
04283	50*)	500	09163	1—50	200	13769	1—50	150	18635	46*)	500
04448	1—50	150	09352	18*)	500	13846	1—50	200	18656	1—50	150
04629	13*)	500	09405	1—50	150	13851	45*)	1.000	18943	1—50	200
04633	1—50	150	09408	40*)	500	14453	25*)	500	19160	15*)	500
04654	07*)	500	09420	10*)	500	14646	35*)	500	19190	1—50	200
04752	50*)	500	09532	21*)	500	15016	10*)	500	19206	1—50	200
04758	1—50	200	09563	1—50	200	15020	34*)	500	19289	1—50	150
04789	1—50	150	09608	1—50	150	15364	27*)	500	19359	47*)	1.000
04884	1—50	150	09665	29*)	500	15371	07*)	500	19417	1—50	150
04899	44*)	1.000	09679	03*)	500	15405	45*)	500	19494	07*)	500
05017	28*)	500	09699	32*)	500	15554	1—50	200	19659	14*)	500
05056	20*)	500	09710	47*)	500	15625	1—50	200	19935	27*)	500

*) На астатнія 49 нумароў аблігацый гэтай серыі выпалі выйгрышы па 150 рублёў.

АТ00303 Адрас рэдакцыі і выдавецтва: г. Мінск, вул. Пушкіна, 55, 3-ці паверх. Тэлефоны: Адказнага рэдактара—149. Адказнага сакратара—150